

ШЧАСЛІВАЯ ПЕРАМОГА НАД ХВАРОБАЙ 4

САКРЭТЫ ПАСПЯХОВЫХ ВУЧНЯЎ



Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 МАЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 102 (29216)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Васіль ГУРСКІ, дырэктар Інстытута эканомікі НАН Беларусі:**

*«Самай дзейснай мерай з'яўляецца ўзважаная палітыка кіраўніцтва ў дачыненні да эпідэміялагічнай сітуацыі. У Беларусі не былі спыненыя вытворчасці, закрытыя граніцы. І гэта самым спрыяльным чынам адбілася на сітуацыі. У краіне ўжо прыняты комплекс першачарговых мер па падтрымцы эканомікі, распрацоўваюцца дадатковыя. Страты, якія панесла Беларусь, непараўнальна меншыя, чым у іншых краінах, якія закрылі свае вытворчасці, граніцы, а цяпер спрабуюць зноў усё наладзіць, аднавіць перапыненыя эканамічныя сувязі. Гэта патрабуе дадатковых сродкаў».*

# Жылі ў бабулі...



У пенсіянеркі з вёскі Бенін Навагрудскага раёна Людмілы БУТРЫМ гадуюцца дзве козачкі.

— Гэта мае карміліцы і сяброўчкі, — жартуе Людміла Уладзіміраўна. — Кармлю, пасу, даю, размаўляю з імі.

Калісьці на падвор'і Бутрымаў былі дзве рагулі, парсючкі, процьма свойскіх птушак. Калі Людміла Уладзіміраўна аўдавела, давялося пазбавіцца ад гадаванцаў і завесці Зорачку і Белку. Дзеці клічуць васьмідзесяцігадовую матулю ў горад, але жанчына, якая прывыкла да вясковага ладу, нават і думаць пра пераезд не хоча.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- **Беларускія прадпрыемствы цалкам забяспечваюць унутраны рынак мяса-малочнай прадукцыяй.**
- Пагадненні паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам аб спрашчэнні візавага рэжыму і аб рэадмісіі, якія ЕС зацвердзіў 27 мая, могуць уступіць у сілу з 1 ліпеня, калі ЕС паспее да канца мая паведаміць беларускаму боку аб завяршэнні працэдур па ратыфікацыі дакументаў.
- **Мінсувязі Беларусі арыентуецца на адмену роўмінгу з Расіяй у верасні, нягледзячы на COVID-19.**
- Больш за чатыры мільёны саджанцаў пасадзілі падчас акцыі «Мільёны маладых дрэў — роднай Мінршчыне!».
- **У Мінскай вобласці ў месцах работы АСВОД з 2012 года не было ніводнага выпадку ўтаплення пры купанні.**

ISSN 1990 - 763X

20102

Трымаем дыстанцыю

## Да ўрача — з асобнага ўваходу

**У апошнія месяцы работа паліклінік істотна змянілася, што звязана з распаўсюджваннем каранавіруснай інфекцыі. У прыватнасці, пацыенты з прастуднымі сімптомамі і тэмпературай цяпер не прыходзяць да ўчастковага ўрача, а накіроўваюцца праз асобны ўваход у інфекцыйны кабінет. Пра тое, як арганізавана яго работа, як выяўляюць пнеўманію і якія сімптомы яна мае, каму неабходна шпіталізацыя, а таксама пра адсутнасць страху заразіцца, расказала ўрач-інфекцыяніст 31-й гарадской паліклінікі Мінска Аліна САЧУК.**



***— Як апошнім часам змянілася работа інфекцыйнага кабінета?***

— Цяпер ён прымае пацыентаў з тэмпературай. Нават калі яна не вельмі высокая ці проста ёсць сімптомы прастуды — закладзенасць носа, насмарк, болі ў горле, — такія людзі павінны звяртацца да ўрача, мінуючы асноўны паток пацыентаў — з асобнага ўваходу. Прыём вядзецца без амбулаторных картак, толькі з пашпартам. Гэта зроблена, каб абмежаваць рух па паліклініцы людзей з сімптомамі рэспіраторных інфекцый. Кабінет працуе з невялікімі перапынкамі (на 15 хвілін) для кварцавання. Таксама ёсць гадзіна перапынку паміж зменамі, калі ідзе прыборка.

Аглядамі, заборамі мазкоў у хворых на каранавірусную інфекцыю, якія лечацца дома, займаюцца выязныя брыгады. Цяпер у нас штодзень ездзяць тры такія брыгады — у розны час па зменах. Асобна выклучаецца брыгада для забору крыві на тэсціраванне. На сёння мы маем экспрэс-тэсты, гэта паскарае працэс атрымання выніку — у лабараторыі такі тэст выконваецца за некалькі хвілін.

СТАР. 4

Паспяховы старт

## «Оскары» малога бізнесу знайшлі сваіх герояў

**Бізнес-конкурс «Чалавек справы» спецыяльна для арганізацый малога і сярэдняга бізнесу абвясціў новы тур — «Паспяховы старт». У вылучэнні кандыдатаў узялі ўдзел рэгіянальныя органы дзяржаўнага праўлення — усе аблвыканкамы і Мінгарвыканкам, Рэспубліканскі саюз прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў і іншыя бізнес-саюзы. Асноўныя партнёры конкурсу — ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР).**

У дзелавой супольнасці нашай краіны конкурс «Чалавек справы» цалкам заслужана называюць «Оскарам» беларускага бізнесу. Разглядаючы кандыдатуры лаўрэатаў, грамадскі савет конкурсу пад кіраўніцтвам акадэміка Пятра Нікіценкі заўсёды кіруецца вельмі жорсткімі крытэрыямі адбору, улічваючы, акрамя эканамічнай сітуацыі, асабістыя якасці кандыдатаў: крэатыўнасць мыслення, нацэленасць на высокі вынік, прадпрымальніцкі дух, інавацыйнасць і прафесіяналізм.

Сёння сярод пераможцаў конкурсу-2020 некалькі прадстаўніц прыгожага полу, а ў спісе лаўрэатаў — прадстаўнікі не толькі сталіцы, але і Мінскай, Брэсцкай, Віцебскай і Гродзенскай абласцей.

Найлепшым прадстаўнікам малога бізнесу па выніках конкурсу «Чалавек справы: паспяховы старт» уручылі дыпломы выдавецкай групы «Справа» і памятныя прызы «На кані!» работы беларускага скульптара Сяргея Гумілеўскага. Цырымонія ўзнагароджання праходзіла 27 мая ў сталічным «Вікторыя Алімп Гатэлі».

СТАР. 2

Ва ўрадзе

# У выдатніках — МНС і Мінлясгас

## По дзяржаўнай праграме летась пабудавана 1,2 мільёна квадратных метраў жылля

**Пра гэта прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС заявіў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў па рэалізацыі дзяржпраграм і ацэнцы іх эфектыўнасці ў 2019 годзе.**

Летась у рамках выканання праграм уведзена ў эксплуатацыю восем устаноў дашкольнай адукацыі, пабудавана і рэканструявана больш за 143 кіламетры рэспубліканскіх дарог.

Эфектыўнасць выканання дзяржпраграм ацэньвае спецыяльная міжведамасная камісія, якую ўзначальвае Міністэрства эканомікі краіны. Згодна са справаздачай гэтай камісіі, з праграм, якія рэалізуюцца ў 2019 годзе, 58 працэнтаў аднесена да высокаэфектыўных і эфектыўных. Дарэчы, у 2018 годзе такіх было толькі 50 працэнтаў. Усяго летась выканана 280 (з 321) мэтавых і 42 (з 50) зводных мэтавых паказчыкаў.

«З аднаго боку, гэта трохі лепей, чым у 2018 годзе. Але зрабіць вывад, што рэалізавана ўсё як трэба, мы сёння не можам. Ёсць пытанні па выкананні зводных мэтавых параметраў да Мінсельгасхарча, Міндзароўя, Мінкультуры, Мінпрацы, Мінтранса, Мінпрама, а таксама да асобных рэгіёнаў», — заўважыў Сяргей Румас. Выдатнікамі, якія выканалі ўсе запланаваныя паказчыкі, сталі МНС і Мінлясгас.

Асобна на пасяджэнні звярнулі ўвагу на выкананне дзяржаўнай праграмы развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства.

«Па выніках 2019 года рэалізацыя гэтай праграмы ацэньваецца міжведамаснай камісіяй на ўзроўні сярэднеэфектыўнай, але праграма зямяшчае сістэмаўтваральныя мерапрыемствы нацыянальнага маштабу ў сферы ІТ», — дадаў кіраўнік урада. Па яго словах, па праграме не дасягнуты два з васьмі мэтавых паказчыкаў, з 58 мерапрыемстваў выканана толькі 24.

Прэм'ер-міністр папрасіў кіраўнікоў галін і рэгіёнаў далажыць яму, што робіцца для выхаду на неабходныя вынікі ў 2020 годзе.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Афіцыйна

# Аб газе, грэчцы і БелАЭС

## Перагаворы па цэнаўтварэнні на газ для Беларусі будуць працягнутыя

**Аб гэтым дамовіліся прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС і старшыня ўрада Расіі Міхаіл МІШУСЦІН падчас тэлефоннай размовы, паведамляе прэс-служба Савета Міністраў Беларусі.**

У ходзе гутаркі бакі абмеркавалі бягучую эпідэміялагічную сітуацыю ў свеце і абмяняліся меркаваннямі аб захадах, якія прымаюцца ў дзвюх краінах для прадухілення распаўсюджвання COVID-19. Кіраўнікі ўрадаў дамовіліся, што міністэрствы аховы здароўя Беларусі і Расіі будуць абменьвацца вопытам у барацьбе з новай каранавіруснай інфекцыяй.

Сяргей Румас і Міхаіл Мішусцін закранулі газавую тэматыку. Па выніках міністрам энергетыкі дзвюх краін будзе дадзена даручэнне аб працягу перагавораў па пытанні цэнаўтварэння на газ для Беларусі.

Бакі закранулі інтэграцыйны парадак дня. У прыватнасці, чарговае пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета ЕАЭС прапанавана правесці ў сярэдзіне ліпеня ў Мінску. Таксама прэм'еры абмеркавалі парадак пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы і дамовіліся аб яго правядзенні ў Мінску пасля пасяджэння Еўразійскага міжурадавага савета.

У размове таксама былі абмеркаваны ход будаўніцтва БелАЭС і гатоўнасць да падпісання міжурадавага пагаднення аб змене працэнтнай стаўкі па крэдыце на будаўніцтва атамнай электрастанцыі. Бакі закранулі і іншыя пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння.

Кіраўнікі ўрадаў абмяняліся віншаваннямі з 75-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Сяргей Румас падзякаваў свайму расійскаму калегу за аператыўнае вырашэнне пытання аб павелічэнні паставак грэцкіх круп у Беларусь у перыяд павышанага попыту.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Парламенцкі дзённік

# Навацыі для сваіх за мяжой

## Змены ў Закон аб грамадзянстве ў першым чытанні плануюць разгледзець дэпутаты на бягучай сесіі

**Сёння ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі праходзіць пасяджэнне Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, прысвечанае абмеркаванню гэтага пытання. Сярод прапанаваных навацый — спрашчэнне працэдуры атрымання грамадзянства асобамі, якія навучаліся ў нашай краіне. З сямі да пяці гадоў скарачаецца тэрмін бесперапыннага пражывання ў Беларусі для атрымання грамадзянства. Ільготным парадкам яго набыцця змогуць скарыстацца таксама тыя, хто атрымаў у Беларусі вышэйшую адукацыю і працуе ў краіне не менш за тры гады.**

Пэўныя змены датычацца і парадку аднаўлення ў грамадзянстве. Гэта, у сваю чаргу, будзе спрыяць наладжванню адносін з беларусамі, якія жывуць у іншых краінах. Пашыранае пасяджэнне адпаведнай рабочай групы Нацыянальнага сходу па справах беларусаў замежжа адбылося ўчора. Група ў сучасным складзе толькі пачынае сваю работу, але захаваліся стасункі, якія ўстанавілі яшчэ мінулыя парламентарыі.

«Мы будзем удзяляць увагу развіццю і ўдасканаленню заканадаўства ў гэтай сферы. У 2014 годзе быў прыняты закон «Аб беларусах замежжа», які дазволіў надаць новы імпульс гэтаму супрацоўніцтву, — расказала **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, кіраўнік рабочай групы Валянціна РАЖАНЕЦ.** — Цяпер у Палаце прадстаўнікоў (у Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ) знаходзіцца на падрыхтоўцы да першага чытання праект закона, які ўносіць змены ў Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь». Там ужо прадугледжаны некаторыя льготы для атрымання беларускага грамадзянства: уводзіцца такое паняцце, як аднаўленне ў грамадзянстве для тых беларусаў, хто некалі быў грамадзянінам Беларусі».

На першым пасяджэнні новага складу рабочай групы ўдзельнікі, сярод якіх ёсць прадстаўнікі МЗС, Савета Рэспублікі, музейнай супольнасці, вылучаць канкрэтныя кірункі, цікавыя прысутным і беларусам за мяжой.

«Важная якасць зносін з беларусамі за мяжой, важна быць на адной хвалі. Беларусь, магчыма, жыве ў іх сэрцах, яны любяць сваю краіну і могуць быць ёй карыснымі. І вось на гэта мы накіруем свае намаганні», — дадала Валянціна Ражанец.

Выдатнай пляцоўкай для абмеркавання надзённых пытанняў па тэме з'яўляецца Кансультатыўны савет па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве замежных спраў, створаны пасля падпісання адпаведнага закона ў 2014 годзе.

«МЗС штогод праводзіць пасяджэнне савета з замежнымі ўдзельнікамі. Мы імкнёмся арганізаваць яго так, каб гэта было не фармальна, каб пры яго падрыхтоўцы і правядзенні ўсплывалі жывыя праблемы і падчас дыялогу ішоў пошук рашэнняў. Не заўсёды гэта лёгка, але мы спрабуем гэта рабіць, — сказаў удзельнік сустрэчы, **намеснік міністра замежных спраў Андрэй ДАПКЮНАС.** — У лістападзе-снежні мы плануем правесці чарговае пасяджэнне Кансультатыўнага савета. Раней яно планавалася на гэты месяц, што пакуль немагчыма. Будзем спадзявацца, што ў канцы года яно зможа адбыцца».

Па словах Андрэя Дапкюнаса, чакаецца папаўненне складу савета сябрамі з Аргенціны, Венгрыі, ЗША, Канады і Швецыі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Оскары» малога бізнесу знайшлі сваіх герояў

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

З больш чым сотні прэтэндэнтаў савет, як заўсёды, выбраў 12 найлепшых. Пераможцам конкурсу «Чалавек справы: паспяховы старт — 2020» у сферы банкаўскіх тэхналогій выбраны старшыня праўлення ЗАТ «РРБ-БАНК» Віталь ДРАНКЕВІЧ.

Гэта самы малады за ўсю гісторыю суверэннай Беларусі кіраўнік банка. Летась Віталь Дранкевіч атрымаў дыплом Executive MBA. Кажа, што менавіта там змог сістэматызаваць веды і вопыт, выпрацаваў стратэгічнае разуменне бізнесу.

Найлепшай у сферы інтэграцыі плацежных сістэм стала дырэктар ЗАТ «Плацежная сістэма Белкарт» Алена НЕСЦЯРОНАК. Летась пры ўдзеле ААТ "Банкаўскага працэсінгавага цэнтра» рэалізаваны праект міжсістэмнай інтэграцыі з нацыянальнай плацежнай сістэмай МІР (Расія), рэалізаваны праект па пераводзе эмісіі картак «Белкарт» на мікрапрацэсар. Першы прыступіў да такой эмісіі Беларусбанк.

Самым «моцным звяном» конкурсу ў прасоўванні замежнага брэнда на беларускім рынку стаў заснавальнік і дырэктар групы кампаній «Sibocom» Канстанцін СІМХОВІЧ. У Канстанціна сямейны бізнес. У 1994 годзе кампанію «Сібаком» заснавалі яго бацька, а кансультантамі былі, у сваю чаргу, ужо яго бацькі — вопытныя кіраўнікі-вытворцы, якія ўсё жыццё адпрацавалі на Мінскім падшыпнікавым заводзе.

Таксама сталі пераможцамі конкурсу: у сферы фінансавых тэхналогій — кіраўнік СТАА іPay Уладзімір КЛІМЕНКА; у сферы вытворчасці здаровага харчавання — сузаснавальнік і дырэктар ТАА «Вытворчая кампанія «Правільны густ» Ірына ДАМАРАЦКАЯ; у сферы будаўнічага праектавання — заснавальнік і дырэктар архітэктурнай студыі «Майстэрні» Максім ВЕРАМЯЮК; у арганізацыі плацяжоў з выкарыстаннем QR-кодаў — дырэктар ТАА « Электронныя сістэмы і сэрвісы» Андрэй ХВАЛЬКО; у сферы інавацыйных, навукаёмістых, высокаэфектыўных тэхналогій — генеральны дырэктар і сузаснавальнік ТАА «Магія святла» Людміла ТАНІНА; у сферы вытворчасці інавацыйных будаўнічых матэрыялаў — заснавальнік і кіраўнік ТАА «Тэпан-бел» Віталь ШАПАВАЛАЎ; у сферы лесанарыхтовак — заснавальнік і дырэктар ТАА «РубімЛес» Мікалай ЛІПКО; у сферы тэхналогій рытэйлу — заснавальнік і генеральны дырэктар ТАА «МЭТР Заслаўе» Дзмітрый ГЛАДКІ; у сферы кансалтынгавых паслуг і аўтсорсінгу — заснавальнік і дырэктар ТАА «Рэгіянальнае агенцтва бяспекі працы» Яўген АСІПЕНКА.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Еўрапейцы незадаволены, як у ЕС змагаліся з пандэміяй

Пра гэта сведчаць вынікі сацапытанняў, якія па замове Euronews былі праведзены ў Францыі, Германіі, Італіі. Большасць грамадзян гэтых дзяржаў па-ранейшаму падтрымліваюць Еўрапейскі саюз і не хочуць з яго выходзіць. Аднак калі ў Германіі за адзіную Еўропу выступае 71 % рэспандэнтаў, то ў Італіі толькі 47 % насельніцтва хоча заставацца ў складзе ЕС. Многія еўрапейцы лічаць, што Еўрасаюз аказаўся зусім не на вышыні падчас пандэміі. 47 % французаў і больш за 60 % італьянцаў пераканаcombined, што крызіс толькі ўзмацніць пазіцыі еўраскептыкаў. Сапраўды, падчас эпідэміі краіны ЕС не вагаючыся закрылі свае граніцы, паказаўшы, што бяспека вышэйшая за салідарнасць. У выніку больш за 70 % еўрапейцаў лічаць, што кожная краіна змагалася з каранавірусам самастойна. Асаблівую занепакоенасць цяпер выклікаюць эканамічная сітуацыя ў Еўропе і стабільнасць еўра. Таксама многія еўрапейцы занепакоеныя становішчам на рынку працы.

### Google распрацуе воблачны сэрвіс для Пентагона

Кампанія Google заключыла кантракт з міністэрствам абароны ЗША на стварэнне воблачнага сэрвісу для барацьбы з кіберпагрозамі. Пра гэта паведаміў партал навін Axios. Паводле яго інфармацыі, здзелка дапаможа Пентагону ажыццявіць пераход да сістэмы множных воблачных сэрвісаў ад розных распрацоўшчыкаў. «Мультывоблачнасць — гэта будучыня», — заявіў віцэ-прэзідэнт Google Cloud Майкл Дэніэлс. Ён падкрэсліў, што адначасовае выкарыстанне воблачных сэрвісаў ад некалькіх распрацоўшчыкаў ужо шырока распаўсюджана сярод прыватных кампаній. «Цяпер гэта будзе датычыцца і федэральнага ўрада», — дадаў Дэніэлс. У кампаніі не ўдакладнілі, на якую суму заключаны кантракт, але заўважылі, што гаворка ідзе «пра сямізначныя лічбы».

### Атрад кітайскіх геадэзістаў дасягнуў вяршыні Эверэста



Такім чынам завершаны ключавы этап місіі чарговага вымярэння найвышэйшага ў свеце горнага піка. Адпаведная аперацыя стартавала 30 красавіка. Атрад геадэзістаў, які выконвае гэту місію, складаецца з прафесійных альпіністаў і спецыялістаў па геадэзіі з міністэрства прыродных рэсурсаў КНР. Пасля заснавання ў 1947 годзе Кітайскай Народнай Рэспублікі было арганізавана 6 дзяржаўных экспедыцый для маштабных вымярэнняў і навуковых пошукаў на гары Эверэст. У 1975-м, калі каманда кітайскіх альпіністаў узышла на гару, ніводзін прафесійны геадэзіст так і не дасягнуў яе вяршыні. Аднак альпіністы ўзялі з сабой спецыяльны маркер, які дапамог вылічыць, што яе вышыня складае 8848 метраў 13 сантыметраў. Другі раз афіцыйныя вынікі замераў Эверэста былі агучаны ў 2005-м — 8844 метры 43 сантыметры.

# ВЯСНА Ў ФАРМАЦЕ ВЭБІНАРА

## Перагаворы патэнцыйных бізнес-партнёраў на відэаканферэнцыі, вэбінары і анлайн-прэзентацыі прадукцыі рамеснікаў

**«Вясна ў Гомелі — 2020» дазволіць у любым пункце свету азнаёміцца з эканамічным патэнцыялам паўднёва-ўсходняга рэгіёна Беларусі. Міжнародная выстаўка, на якой летась прадстаўлялі прадукцыю 300 айчынных і замежных кампаній і якую наведалі дэлегацыі з 32 краін свету, гэтым разам працуе ў фармаце міжнароднай віртуальнай платформы.**



Выстаўка дасягненняў рэальнага сектара эканомікі — візітная картка Гомельскай вобласці і адно з самых значных мерапрыемстваў рэгіёна. 20 гадоў запар яна аб'ядноўвае прадпрыемствы з розных куткоў свету, заклікае да ўдзелу ўлады, кіраўнікоў дыпмісій і гандлёва-прамысловых палат.

У новым фармаце «Вясна ў Гомелі — 2020» прадстаўлена трыма асноўнымі анлайн-блокамі. Першы — «Дзелавая Вясна» — прэзентуе прадукцыю і паслугі прадпрыемстваў, прапануе ўдзел у вэбінарах, а таксама дае магчымасць перагавораў паміж патэнцыйнымі партнёрамі ў фармаце B2B.

Другая анлайн-пляцоўка — «Смачная Вясна» — аб'ядноўвае прадстаўнікоў рэстараннага бізнесу, кавярняў і рознічнага гандлю. Нарэшце трэці блок — «Гомельская Вясна» — гэта своеасаблівае анлайн-свята рамеснікаў з розных куткоў Беларусі.

Новы фармат работы міжнароднага праекта можа стаць для ўдзельнікаў выдатнай магчымасцю замацаваць сваю актыўнасць на інтэрнэт-платформах. У гэтым упэўнены арганізатары.

— Цікавасць да выстаўкі выказалі ўжо больш за 200 удзельнікаў з 12 краін свету, сярод якіх Расія, Казахстан, Малдова, Славакія, Сербія, Грузія, Германія, Індыя, Літва, — тлумачыць **прэс-сакратар гомельскага аддзялення Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Ірына ТАКОЕВА.** — Прадпрыемствы, якія сталі ўдзельнікамі анлайн-форуму, змаглі прадставіць інфармацыю пра сваю работу ці размясціць камерцыйныя прапановы бясплатна.

Аднак, каб узяць удзел у выстаўцы, многім давялося перагледзець візуалізацыю і напаўненне сваіх сайтаў. На некаторых з іх інфармацыя падавалася толькі на рускай мове, чаго было недастаткова.

— Гомельскае аддзяленне Беларускай гандлёва-прамысловай палаты стварыла бізнес-візітоўкі прадпрыемстваў, — дадала Ірына Такоева. — Збіралі актуальную інфармацыю, дапоўнілі матэрыялы анкетавання БелГПП, дадалі рэкламныя ролікі і прэзентацыі. Была распрацавана форма камерцыйнай прапановы, якая адпавядае патрабаванням Міністэрства замежных спраў Беларусі.

Многія ўдзельнікі безумоўным плюсам новага фармату выстаўкі лічаць эканомію сродкаў на арганізацыю візіту.

Запыты на рэгістрацыю і ўдзел у форуме ад прадпрыемстваў працягваюцца. Таму ёсць намер працягнуць работу анлайн-выстаўкі і пасля запланаванага раней 10 чэрвеня.

Як адзначыла **генеральны дырэктар Гомельскага аддзялення Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Марына ФІЛОНАВА,** толькі ў першы дзень работы выстаўкі на перагаворнай пляцоўцы было прадстаўлена больш за 100 прадпрыемстваў вобласці. Запрашэнне таксама прынялі 13 гандлёва-прамысловых палат, свабодных эканамічных зон з 12 краін. Многія замежныя кампаніі да канца мая афіцыйна не працуюць, але з некаторымі патэнцыйнымі партнёрамі ўжо наладжаны кантакт. У чэрвені чакаецца яшчэ больш удзельнікаў.

Цяпер арганізатары адзначаюць папулярнасць вэбінараў як формы стасункаў паміж удзельнікамі. Сярод іх, напрыклад, вэбінар з удзелам прадстаўніка іспанскага рэстараннага бізнесу, а таксама вэбінар, прысвечаны магчымасцям супрацоўніцтва паміж індывідуальнымі прадпрымальнікамі Беларусі і Кітая.

Між тым, пры дапамозе анлайн-пляцоўкі больш за 70 майстроў-рамеснікаў прадстаўляюць вырабы з дрэва і керамікі, дзіцячыя цацкі, дэкор, посуд, упрыгажэнні і касметыку з натуральным саставам. Прэзентуецца таксама адзенне, прадметы інтэр'еру і фермерскія прадукты харчавання. Удзельнікі выстаўкі падкрэсліваюць, што могуць даставіць сваю прадукцыю ў любы пункт свету.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

---

Пішам разам!

## «Агульная дыктоўка» пройдзе анлайн

**Папулярная сацыяльна-адукацыйная ініцыятыва, якая адбываецца з 2017 года ў падтрымку беларускай мовы, аб'ядноўвае сотні неабыякавых да сваёй мовы і культуры беларусаў у розных краінах свету — так, летась да яе далучыліся ўдзельнікі з ЗША, Польшчы, Расіі і Украіны. Сёлета «Агульная дыктоўка» пройдзе ў новым фармаце.**

Напісаць дыктоўку можна будзе 6 чэрвеня, толькі анлайн, у прамым эфіры на YouTube. Для гэтага трэба папярэдне (да 4 чэрвеня ўключна) зарэгістравацца на сайце арганізатараў lidskae.by. Тэмай дыктоўкі, паведамляецца на старонцы рэгістрацыі, стануць традыцыі і карані, каштоўнасці, якія нас аб'ядноўваюць.

Акцыя 2020 года мае і яшчэ адну важную адметнасць — дабрачынны кірунак. За кожнага ўдзельніка дыктоўкі брэнд «Лідскае піва» пералічыць пяць рублёў на дабрачынны рахунак Міністэрства аховы здароўя, а па выніках праекта дадатковы перавод будзе зроблены за кожную работу, напісаную на 9 і 10 балаў.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

---

Класныя навіны

## У раскладзе дзесяцікласнікаў з'явіцца чарчэнне

**Зацверджаны тыпавы вучэбны план для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі на 2020/2021 навучальны год. Як растлумачылі ў прэс-службе Міністэрства адукацыі, у ім адбудуцца нязначныя змены ў колькасці вучэбных гадзін на вывучэнне асобных прадметаў у 10 класах (у параўнанні з тыпавым вучэбным планам 2019/2020 навучальнага года).**

Змяненні звязаны з абнаўленнем зместу агульнай сярэдняй адукацыі, якое ажыццяўляецца паэтапна, пачынаючы з 2015/2016-га. У наступным навучальным годзе па новых праграмах будуць навучацца ўжо дзесяцікласнікі.

«Акрамя таго, з новага навучальнага года ў 10 класах будзе вывучацца такі прадмет, як «Чарчэнне». У сувязі з тым, што вывучэнне геаграфіі Беларусі ў 2019 годзе было перанесена ў 9 класы, на яе засваенне ў 10 класах выдзелена адна гадзіна ў тыдзень. У 10-11 класах тыпавым вучэбным планам прадугледжана вывучэнне інфарматыкі на базавым (адна гадзіна ў тыдзень) і павышаным (тры гадзіны ў тыдзень) узроўнях», — адзначылі ў ведамстве.

Для 1—9 класаў у тыпавым навучальным плане змяненняў у пераліку навучальных прадметаў і колькасці гадзін на іх вывучэнне не адбылося. Захавана магчымасць вывучэння асобных прадметаў на павышаным узроўні ў 8-9 (дапрофільная падрыхтоўка) і 10-11 класах (профільнае навучанне).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

По той бок прылаўка

## Продаж новых тавараў і былых у карыстанні — асобна?

### Рэалізацыю новых і старых адзення і абутку ў адной краме прапануюць забараніць у Беларусі

**Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю прапануе абмеркаваць праект пастановы Савета Міністраў, які прадугледжвае ўвядзенне абмежаванняў на продаж былых у карыстанні швейнага і трыкатажнага адзення, футравых вырабаў, галантарэйных тавараў і абутку ў адным гандлёвым аб'екце разам з новымі таварамі.**

Дзеянне пастановы будзе распаўсюджвацца на суб'екты, якія вядуць рознічны гандаль нехарчовымі былымі ў карыстанні і стокавымі таварамі. Згодна з праектам дакумента, да нехарчовых былых у карыстанні тавараў адносяцца вырабы з бачнымі прыкметамі нашэння, мыцця, эксплуатацыі альбо належнай якасці, але без тварных цэтлікаў (этыкетак), а таксама тавары, прынятыя па дамове паміж камісіянерам і камітэнтам на камісію.

Праект дакумента распрацаваны па прапанове канцэрна «Беллегпрам», каб прыняць дадатковыя меры па абмежаванні рэалізацыі на тэрыторыі краіны былых у карыстанні нехарчовых тавараў лёгкай прамысловасці. Паводле інфармацыі канцэрна, часцяком у гандлёвых аб'ектах разам з таварамі такога тыпу рэалізуюцца стокавыя тавары. Арганізацыі і фізічныя асобы-імпарцёры, дэкларуючы стокавыя тавары ў якасці сэканд-хэнду, фактычна ўхіляюцца ад выплаты мытных пошлін на новыя гатовыя вырабы (у сярэднім 15 працэнтаў ад рэальнай цаны). Пры гэтым дзеючыя ў Беларусі структуры, якія вядуць аптовы і рознічны гандаль сэканд-хэндам, у сваіх рэкламна-інфармацыйных матэрыялах нават не хаваюць, што частка прадукцыі, якая рэалізуецца, — новыя стокавыя вырабы.

Істотнае павелічэнне аб'ёмаў рэалізацыі тавараў кшталту сэканд-хэнд у Беларусі за апошнія некалькі гадоў пацягнула за сабой маштабнае пераразмеркаванне рынку — ад айчынных тавараў да імпартных, а продаж стокавых тавараў разам з сэканд-хэндам стварыў няроўныя ўмовы канкурэнцыі для айчынных вытворцаў, адзначылі ў ведамстве. Абмежаванні на продаж у адным гандлёвым аб'екце сэканд-хэнду і новых тавараў, у тым ліку стокавых, створаць дадатковыя ўмовы для развіцця справядлівай канкурэнцыі паміж айчыннымі і замежнымі вытворцамі тавараў лёгкай прамысловасці, лічаць у міністэрстве.

Паводле звестак гандлёвага рэестра, рознічны гандаль нехарчовымі былымі ў карыстанні таварамі на 1 красавіка вялі 928 суб'ектаў у 1198 крамах.

Праект пастановы знаходзіцца на сайце міністэрства. Прапановы можна накіроўваць на электронны адрас n.cherepovich@mart.gov.by.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

---

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## У ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ — «#РАЗАМЗБАЦЬКАМІ»

**1 чэрвеня, у Дзень абароны дзяцей і Сусветны дзень бацькоў, моладзь Прынямоння дае старт рэспубліканскаму маладзёжнаму праекту «#разамзбацькамі» — па добраўпарадкаванні дзіцячых дваровых пляцовак сіламі бацькоў і іх дзяцей разам з валанцёрамі руху «Добрае Сэрца» і работнікамі ЖКГ.**

Ініцыятыва Гродзенскай абласной арганізацыі БРСМ выклікала шырокі грамадскі рэзананс, а праект, задуманы як абласны, быў падтрыманы на ўзроўні краіны і адразу набыў вышэйшы статус.

Узяць удзел у ім можа кожны ахвотны. Галоўны дэвіз — неабыякавасць. Так, 1 чэрвеня моладзь Гродзеншчыны добраўпарадкуе больш за 20 аб'ектаў.

На дзіцячых пляцоўках, дзе папрацуюць «#разамзбацькамі», прапануецца ўстанавіць таблічкі са словамі падзякі гэтым сем'ям.

## ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ

**з'явяцца ў выхадныя дні па маршруце Мінск — Брэст — Мінск, паведамілі ў прэсцэнтры магістралі.**

Так, з 29 мая прызначаны цягнік міжрэгіянальных ліній эканом-класа № 690/681 Брэст — Мінск — Брэст адпраўленнем з Брэста ў 14.30 і прыбыццём у Мінск у 18.27, адпраўленнем з Мінска ў 20.16 і прыбыццём у Брэст у 0.15. Цягнік будзе курсіраваць па пятніцах і нядзелях, за выключэннем 3 ліпеня. На гэтую дату ён будзе адменены і прызначаны на 2 ліпеня.

З 31 мая прызначаецца цягнік міжрэгіянальных ліній эканом-класа № 667/646 Мінск — Брэст — Мінск. Ён будзе адпраўляцца з Мінска ў 11.44 і прыбываць у Брэст у 16.16, з Брэста цягнік адпраўляецца ў 17.28 і прыбудзе ў Мінск у 22.18. Цягнік будзе курсіраваць па нядзелях.

## «БАМБІЎ» НА ДАВЕРЫ І НЯЎВАЖЛІВАСЦІ

**У сталіцы затрыманы серыйны махляр, ахвярамі якога сталі кіроўцы таксі.**

У аператыўна-дзяжурную службу звярнуўся адзін з таксістаў, які паведаміў, што кліент яго падмануў і не аплаціў паездку.

Высветлілася, што заяўнік прывёз кліента на ўказаны адрас, а той паведаміў, што гэта не канчатковы пункт прызначэння. Мужчына растлумачыў, што зойдзе да знаёмага, каб забраць пазычаныя грошы, і вернецца. За чаканне кліент паабяцаў добрую аплату. Потым ён папрасіў у кіроўцы 150 рублёў, якія таксама паабяцаў вярнуць пасля сустрэчы са знаёмым. Аднак пасля доўгага чакання мужчына так і не з'явіўся.

У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікам міліцыі ўдалося ўстанавіць асобу мужчыны. Ім аказаўся 48-гадовы жыхар сталіцы. Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, раней ён таксама здзейсніў аналагічны ўчынак: пад тым самым выглядам папрасіў у іншага кіроўцы таксі 150 рублёў, якія пасля не вярнуў.

Як высветлілася, гэта не адзіны спосаб крадзяжу грошай, што выкарыстоўваў мужчына. Яшчэ ў аднаго таксіста падазраваны выкраў 100 рублёў з бардачка машыны, пакуль кіроўца не звяртаў увагі.

Устаноўлена, што ўсяго жыхаром сталіцы былі выкрадзены грашовыя сродкі на суму больш за 400 рублёў. Вядома, што іх ён патраціў на ўласныя патрэбы.

Зламыснік змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання. Раней ён ужо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці. Супрацоўнікі міліцыі праводзяць далейшыя мерапрыемствы па ўстанаўленні пацярпелых, а таксама доказванні іншых фактаў супрацьпраўнай дзейнасці мужчыны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

З выздараўленнем!

# 24 дні ў рэанімацыі

## правяла маладая шматдзетная матуля, але справілася з хваробай

**Маладой шматдзетнай маці Настассі Ломпік давялося правесці 24 дні ў рэанімацыі 6-й клінічнай бальніцы Мінска, з іх 11 дзён — на апараце ШВЛ. Дыягназ COVID-19, ускладнены пнеўманіяй, быў пастаўлены жанчыне на 33-м тыдні цяжарнасці. Але пры дапамозе ўрачоў маладая мама справілася з хваробай і днямі пераведзена з рэанімацыйнага аддзялення. Гісторыю няпростага выздараўлення расказвае афіцыйны тэлеграм-канал Міністэрства аховы здароўя.**



На 33-м тыдні цяжарнасці стан жанчыны імкліва пагоршыўся.

— Праз некалькі дзён пасля шпіталізацыі мы адзначылі моцнае павелічэнне дыхальнай недастатковасці. Для таго, каб выратаваць маці і малую, было прынята рашэнне аб правядзенні тэрміновай аперацыі кесарава сячэння, — расказвае **намеснік галоўнага ўрача па акушэрска-гінекалагічнай дапамозе 6-й клінічнай бальніцы Мінска Ірына БОРЫС.**

Барацьба за маладую маму вялася ўсім аддзяленнем інтэнсіўнай тэрапіі, 11 дзён Настасся правяла на апараце ШВЛ. Маладая жанчына стала другой у Беларусі пацыенткай, якую лячылі прэпаратам «Фавіпіравір» («Авіган»). Таксама пацыентка атрымлівала плазму. Сучасны апарат ШВЛ Hamilton-C3 высокага класа з інтэлектуальным рэжымам вентыляцыі таксама прыйшоў на дапамогу ў цяжкай сітуацыі. У выніку жанчына справілася з хваробай.

Цяпер маладая мама настроена аптымістычна і нават пачала выконваць простыя практыкаванні. Дома жанчыну чакаюць муж і два старэйшыя сыны.

У 6-й клінічнай бальніцы Мінска ўжо каля двух дзясяткаў жанчын, у якіх быў выяўлены COVID-19, нарадзілі здаровых дзетак. Як адзначыў **галоўны ўрач Ігар ЮРКЕВІЧ**, медустанова працуе з каранавіруснай інфекцыяй з 29 лютага. За гэты час з бальніцы было выпісана і пераведзена на амбулаторны этап больш за 900 пацыентаў.

*Па звестках на 27 мая ў Беларусі выяўлена 38 956 выпадкаў COVID-19 (897 новых інфіцыраваных за суткі). За час распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі папраўіліся і выпісаны 15 923 пацыенты, у якіх раней быў пацверджаны дыягназ (837 за апошнія суткі), 214 чалавек выратаваць не ўдалося (шэсць памерла на працягу апошніх сутак). За гэты час праведзена 485 534 тэсты (12 628 за суткі).*

# Да ўрача — з асобнага ўваходу

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Куды звяртаюцца людзі з пнеўманіяй?***

— У паліклініцы ў першую чаргу — у інфекцыйны кабінет. Калі праводзіцца агляд і рэнтгенаўскі здымак, выяўляецца пнеўманія і пры гэтым ёсць крытэрыі для шпіталізацыі, якія ў нас дакладна прапісаны, пацыент накіроўваецца ў стацыянар. Хворы можа і адмовіцца ад шпіталізацыі, у такім выпадку ён застаецца лячыцца дома. Тады мазок на каранавірусную інфекцыю бяруць спецыялісты інфекцыйнага кабінета.

***— Каму неабходна шпіталізацыя?***

— Як правіла, людзям старэйшага ўзросту, пацыентам, якія маюць спадарожныя захворванні, што могуць абцяжарыць цячэнне не толькі каранавіруснай інфекцыі, а і любой пнеўманіі. Здараюцца такія нетыповыя сітуацыі, калі пнеўманія працякае без яркай клінічнай карціны, у прыватнасці, без тэмпературы. У такім выпадку мы ўсё роўна бяром мазок на COVID-19.

***— Якія сімптомы ў пнеўманіі?***

— Гэта тэмпература, прычым не заўсёды яна вельмі высокая — здараецца, працяглы час трымаецца каля 37 градусаў. Бывае і 37,5, 38, 39. Часам пацыенты скардзяцца, што доўга хварэлі, лячыліся самі, але стан не паляпшаецца, наадварот, становіцца горшы, непакоіць кашаль. Можа быць боль у баках — абодвух ці адным, пачуццё сціснутасці, штосьці перашкаджае дыхаць. У асноўным, канешне, гэта павышаная тэмпература і кашаль.

***— Колькі чалавек за змену цяпер даводзіцца прымаць?***

— Бывае па-рознаму, заўсёды больш людзей пасля выхадных. У апошнія дні стала крыху менш звароТаў. Самы пік па захваральнасці ў нас звычайна ў лютым, сакавіку і пачатку красавіка. У гэты час шмат прастуд, грыпу і, адпаведна, пнеўманій — розных. Мы прымаем да 30—40 чалавек у адну ўрачэбную змену. З надыходам цяпла сітуацыя паляпшаецца. Але каля 20 пацыентаў за змену звяртаецца.

***— На што ўплывае надыход цяпла?***

— Менш становіцца прастудных захворванняў, бо людзі менш пераахалоджваюцца. Летам людзі нячаста хварэюць, бо пачынаецца сезон садавіны і агародніны, мы атрымліваем шмат вітамінаў, у тым ліку вітамін D



дзякуючы вялікай колькасці сонца. Арганізм іх назапашвае, і наш імунітэт становіцца мацнейшы. Вясной тыя запасы, якія мы атрымалі за лета і восень, заканчваюцца, мы пачынаем больш хварэць. Але не трэба забываць, што рэспіраторныя інфекцыі цыркулююць круглы год, гэтак жа як і грып. Дарэчы, ёсць меркаванне, што і каранавірусная інфекцыя не знікне, а стане адным з такіх сезонных рэспіраторных захворванняў. Таму ў любы час года варта максімальна сябе абараняць, у прыватнасці, ад грыпу — з дапамогай вакцыны. Гэта адзін з фактараў, здольных прадухіліць пнеўманію.

***— Інфекцыяністы першыя сутыкнуліся з COVID-19...***

— У студзені—лютым усе мы толькі чулі пра яго. Першымі выпадкамі былі замежныя студэнты, якія прыязджалі з канікул, нашы студэнты, якія вучацца за мяжой, людзі, якія ездзяць за мяжу. У той час было да канца незразумела, як сябе ахоўваць. Сёння мы ведаем, што на прыёме пальчатак, маскі і экрана будзе дастаткова. А спачатку мы сапраўды не разумелі: гэта інфекцыя кшталту ліхаманкі Эбола з Афрыкі і варта надзяваць касцюм, ці ўсё ж не? Да таго ж пацыент, на жаль, не заўсёды паведамляе ўрачу поўную інфармацыю, у тым ліку пра тое, якія краіны наведваў. У гэтым заўсёды пытанне.

***— Няўжо ў паліклініцы інфекцыяністу не патрэбна поўная ахова?***

— Сапраўды, цяпер у нас не такая поўная экіпіроўка, якая яна можа быць. Цалкам абмундзіраванне выкарыстоўваюць выязныя брыгады. Зноў-такі, у стацыянарах у медперсаналу ахоўныя касцюмы. Мы не ў такім цесным кантакце з пацыентам і не аказваем такую дапамогу, як работнікі рэанімацыі, таму ў нас крыху іншыя правілы. Але ўсё роўна гэта ахоўны халат, маска або рэспіратар, экран ці акуляры.

***— Ці быў страх заразіцца?***

— Асабіста ў мяне — не. Я скончыла медыцынскі ўніверсітэт чатыры з паловай гады таму, інтэрнатуру праходзіла на базе мінскай інфекцыйнай бальніцы, дзе атрымала карысны вопыт. Пасля гэтага працую інфекцыяністам у паліклініцы. Страху не было ніколі — ні падчас інтэрнатуры, ні падчас работы ў паліклініцы.

Да таго ж ёсць куды больш небяспечныя інфекцыі, якія могуць наносіць істотную шкоду арганізму і нашмат хутчэй распаўсюджваюцца, маюць і большую лятальнасць, і вышэйшы працэнт ускладненняў. Зразумела, што каранавірусная інфекцыя да канца не вывучана, мы яшчэ шмат пра яе даведаемся. Але пакуль відавочна, што лятальнасць не настолькі высокая, як у такіх небяспечных хвароб, як чума ці халера.

***— Апошнім часам здаецца, што многія з нас расслабіліся і перасталі насіць маскі нават у тым жа грамадскім транспарце. Дзе трэба насіць маску?***

— Там, дзе шмат людзей. Канешне, у першую чаргу гэта грамадскі транспарт. У ім я параіла б і пальчаткі — гэта дадатковая ахова, бо мы нават не звяртаем увагу, як дакранаемся да свайго твару. Тут маска і пальчаткі маюць сэнс. Тое самае можна сказаць і пра магазіны. Калі мы ў пальчатках бяром прадукты, да якіх да нас дакраналіся іншыя, гэта прафілактыка не толькі каранавіруса, але і тых інфекцый, якія могуць перадавацца аналагічным шляхам. Надзяваць маску неабходна, калі хварэе хтосьці ў сям'і. Гэта важна найперш для таго, хто хварэе, калі ён наведвае памяшканні агульнага карыстання. Маска надзяваецца, каб абараніць сваіх блізкіх. На вуліцы, калі вы ідзяце не ў кампаніі, яна, канешне, не трэба.

***— Ці патрэбна маска, калі ідзеш у паліклініку?***

— Магчыма, у гэтым і ёсць сэнс. Нягледзячы на тое, што патокі пацыентаў максімальна размяжоўваюць, людзі могуць не заўважыць аб'яву, пайсці не туды — такое, на жаль, здараецца. Калі ёсць магчымасць, трэба захоўваць дыстанцыю, гэта таксама важная мера прафілактыкі.

**Алена КРАВЕЦ.**


## Дукорский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области 30 июня 2020 года в 15.00 в здании Дукорского сельского исполнительного комитета, расположенного по адресу: аг. Дукора, ул. Речная, д. 14 Пуховичского района Минской области проводит открытый аукцион по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Наличие ограничений | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** аг. Дукора, ул. Червякова, 96, 624483402101001644 | 0,1032 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | Водоохранная зона реки Свислочь | 1593,39 + расходы за объявление в СМИ | 4617,99 | 461,80 |
| **Лот № 2** аг. Дукора, пер. Солнечный, 8, 624483402101001645 | 0,1499 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | | 1638,03 + расходы за объявление в СМИ | 6707,73 | 670,77 |
| **Лот № 3** д. Подлипки, уч. 3, 624483405101000096 | 0,1260 | Сети газоснабжения | Охранная зона объектов газораспределительной системы площадью 0,0101 га | 1747,96 + расходы за объявление в СМИ | 4260,44 | 426,04 |
| **Лот № 4** д. Подлипки, уч. 12, 624483405101000101 | 0,1456 | Сети газоснабжения | Охранная зона объектов газораспределительной системы площадью 0,0125 га | 2032,62 + расходы за объявление в СМИ | 4923,17 | 492,32 |

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на р/с BY23AKBB36006250900060000000, УНП 600537220, код платежа 04901 (частная собственность).

Получатель: главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области.

Банк: ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, BIC AKBB BY2X.

**Участники аукциона должны представить следующие документы:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенных банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально в случае если интересы покупателя представляет это лицо).
4. Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **17.00 24 июня 2020 года по вышеуказанному адресу.**

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона осуществить оплату земельного участка и расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения;

в течение двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;

получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ, разработать и утвердить строительный проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий два года.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, выставленными на аукцион, путем выезда на место нахождения участка.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Контактные телефоны: **(801713) 63935, 99436, 99322.**

Сайт Пуховичского райисполкома.



## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ЗАО «Райагропромэнерго»** (УНП 700003443) в лице ликвидатора Осипенко А.Г., тел. +375 29 155-37-27.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **09 июня 2020 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

Предмет торгов – **здание многофункциональное, с инв. № 710/С-74354, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188. Здание котельной, с инв. № 710/С-2705, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/1. Здание распределительного устройства, с инв. № 710/С-74953, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/2.**

Начальная цена предмета торгов – 162 000,00 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 155-37-27.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 29.05.2020 г. с 09.00 по 08.06.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 25.04.2020 г.

Сямейная газета
Выпуск № 10 (146)

# ФОРМУЛА З УСІМІ ВЯДОМЫМІ

*Адна з прыкмет нашага часу — бацькоўскія абмеркаванні метадаў выхавання дзяцей. Спрэчкі на гэты конт ідуць у рознай танальнасці і на розных узроўнях, ад інтэрнэт-форумаў і дзіцячых пляцовак да круглых сталоў з сур'ёзнымі экспертамі. І не падлічыць, колькі коп'яў зламана вакол дазволу і забароны, устанаўлення меж і пакарання, выхавання без гвалту і, крый божа, нанясення псіхалагічных траўмаў.*

*...Мае бацькі, якім за 60, а тым больш тыя, хто памятае першыя пасляваенныя гады, калі згадваюць пра ўласнае дзяцінства, шчыра прызнаюцца: ім і іх родным было не да цяперашняй псіхалогіі ды філасофіі. Помніцца, адзін з даўніх маіх герояў разважаў: «Нас гадавалі паводле «Рэспублікі ШКІД» і Макаранкі — у найлепшым выпадку. Дзе дапамагаў калектыў — школа, піянерыя, камсамол, дзе дзейнічаў асабісты прыклад, а дзе, як у маёй суседкі, якая бралася за любую работу, каб толькі падняць дзяцей, паспявалі толькі прасачыць, каб малыя былі абутыя-адзетыя, не галодныя і двоек у школе не нахапалі. А цяпер іншыя каштоўнасці, разумееце?»*

*Праз больш чым 15 гадоў пасля той размовы, маючы ўжо не самы вялікі, але свой уласны бацькоўскі і жыццёвы вопыт, мяркую, што разумею. Не бяруся параўноўваць жыццё ў прынцыпова розных краінах, грамадствах, эканоміках і сістэмах каштоўнасцяў. Не рызыкну сказаць, што нам, бацькам «пакалення Z», лягчэй гадаваць дзяцей, чым савецкай інтэлігенцыі 1960-х альбо тым, хто да дрыжыкаў ясна помніць татальны дэфіцыт і размыванне маральных устояў у 90-я. Але выразна адчуваю, што ў цяперашніх стасунках соцыуму, бацькоў і дзяцей мне падабаецца. «А» — адказнасць. Разуменне таго, што быць мамай і татам — гэта не проста нарадзіць агульнае дзіця, але выхаваць, навучыць, закласці ў яго тыя асноўныя характарыстыкі і ўменні, якія спатрэбяцца ў жыцці. І, зноў жа, несці адказнасць. Перад сабой і блізкімі, каб дзяцей не заводзілі, як коцікаў ды сабачак, а нараджалі свядома, рыхтуючыся да кардынальных перамен у сваім жыцці, звычках, свядомасці. Перад настаўнікамі, якія будуць вучыць дзяцей усякім неабходным дысцыплінам, развіваць спартыўныя і творчыя здольнасці, вучыць думаць, спасцігаць новае — але не абавязаныя іх, нашых дзяцей, выхоўваць. Перад самімі дзецьмі, якія ўбіраюць і найлепшыя, і далёка не самыя добрыя нашы рысы і манеры паводзін, пераймаюць тую мадэль стасункаў з іншымі людзьмі, якую транслюем мы, і, дарэчы, таксама вучацца — альбо не вучацца — адказнасці за свае словы і ўчынкі.*

*Часам здаецца, што ад сучасных бацькоў грамадства патрабуе занадта многа: і сачыць за дзіцем у тры вокі 24 гадзіны ў суткі, і не задушыць гіперапекай, і забяспечваць мноства патрэб дзіцяці, і не скаціцца ва ўсёдазволенасць, і не дапускаць маральнага і фізічнага гвалту, і не вырасціць інфантыла, які атрымлівае глыбокую душэўную траўму пры кожным сутыкненні з рэальным светам... І ўсім ты вінен, вінен, вінен, але ж немагчыма кантраляваць абсалютна ўсе аспекты жыцця. У такіх выпадках асабіста мне дапамагае тэрмін «дастаткова добрая маці» — дзякуй, шаноўны брытанскі псіхатэрапеўт і педыятр Дональдс Вудс Вінікот, за тое, што сфармуляваў гэту простую і жыццёвую штуку. Дастаткова добрыя маці/бацька — гэта тыя людзі, якія робяць для развіцця і выхавання дзяцей усё, што ў іх сілах, але пакідаюць за сабой права на памылку. Словам, гэта не робаты і не загнаныя ў пастку перфекцыянізму няшчасныя істоты, а нармальныя жывыя людзі, якія ведаюць, што няма раз і назаўжды прапісанага зводу правіл, які падыходзіць для ўсіх, і ці «правільна» ты выгадаваў дзяцей, стане зразумела толькі праз час.*

*Таму ў думках я заўжды дапісваю да свайго «А» — адказнасць — яшчэ адну літару. «Л» — любоў. На сёння гэта галоўныя мае бацькоўскія і сямейныя каштоўнасці.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Наш дом

# Такі доўгачаканы і любімы

**У пакоях будуць карціны, у двары — ружы. Як шматдзетная сям'я будуе жыллё з дапамогай дзяржаўнай субсідыі**



**Сям'я Дзядзюкоў будуе дом, як і многія на іх вуліцы, у іх населеным пункце, у нашай краіне. «Мы яшчэ дабудоўваем — і ўжо любім наш дом, — кажа Святлана. — Разам з дзецьмі даўно спланавалі, дзе што будзе стаяць, як мы размесцімся, як упрыгожым пакоі, кухню, дзе якія кветкі пасадзім у двары. Абавязкова будуць ружы. Застаецца зусім няшмат у параўнанні з тым, што ўжо зроблена. Летам, спадзяёмся, перабяромся ў свой такі доўгачаканы, такі любімы дом».**

## Сібірскі пачатак

Святлана, шматдзетная мама з вёскі Чарнаўчыцы, што пад Брэстам, падзялілася гісторыяй іх сям'і і дома. Цяпер яна дакладна ведае, што шлюбы адбываюцца на нябёсах. Расказала, што лёсы іх з Аляксандрам дзіўным чынам складваліся падобна і развіваліся паралельна, каб потым аднойчы сысціся ў пункце перасячэння.

Бацькі абодвух сужэнцаў маладымі хлопцамі падаліся некалі з Брэстчыны на будаўніцтва БАМа (Байкала-Амурскай магістралі). Абодва беларусы ў далёкім Краснаярскім краі сустрэлі сібірачак і ажаніліся. Такім чынам, і ў Святланы, і ў Аляксандра бацькі тутэйшыя, а маці з Сібіры. Абое яны там і нарадзіліся, за тысячы кіламетраў ад Беларусі, там раслі, хадзілі ў школу. І абедзве сям'і недзе ў пачатку 90-х гадоў па падобных прычынах з розных месцаў вярнуліся на малую радзіму мужоў. «Бо тут, у нас, было яшчэ не зусім цяжка выжываць, а там зусім складана стала», — успамінае Света матывы рашэння бацькоў. Вось так яна і Саша больш за дваццаць гадоў таму апынуліся ў адной вёсцы Брэсцкага раёна. Але Чарнаўчыцы — населены пункт немалы, тут некалькі тысяч чалавек жыве. Да часу яны не ведалі адно аднаго, кожны з іх стварыў сваю сям'ю. І ў кожнага сям'я не адбылася... У выніку — пасля разводу Святлана засталася з дачкой, і Аляксандр застаўся са сваёй дачкой. А калі гэтыя двое людзей з такімі падобнымі лёсамі сустрэліся, паміж імі і прамільгнула тая самая іскра, што дала пачатак каханню ды новай шчаслівай сям'і.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Ніці сяброўства

# КОЖНАМУ ДЗІЦЯЦІ ПАТРЭБЕН СВОЙ ДАРОСЛЫ

## Як дапамагчы сіротам... і не нашкодзіць



**Тата Арцёма сышоў з сям'і, калі той яшчэ не хадзіў у школу. Мама засталася адна падымаць двух сыноў у камунальнай кватэры. Жылі вельмі цяжка. Калі Арцёму споўнілася 13, мама памерла. Хлопчык застаўся сіратой. Бабуля з дзядулем афармілі апеку, каб падлетка не забралі ў школу-інтэрнат. Арцём лічыць сябе шчаслівчыкам, бо яму ўдалося застацца ў сям'і, ён усведамляў і цаніў тое, што рабілі для яго родныя. Сёння ў мужчыны моцная сям'я: любімая жонка і пяцёра дзяцей. Аднаго са сваіх сыноў ён усынавіў восем гадоў таму. Але гэта не адзінае дзіця, якому мужчына дапамог. Арцём ГАЛАВІЙ стварыў установу па сацыяльнай адаптацыі дзяцей-сірот «Ніткі сяброўства». Арганізацыя шукае для дзяцей, у якіх амаль не засталося шанцаў знайсці сям'ю, дарослых сяброў, што могуць і хочуць дапамагчы малым адаптавацца да жыцця ў «вялікім свеце», ды проста падтрымаць іх у цяжкія хвіліны. У нашай краіне такое сяброўства называецца патранатным выхаваннем. Дарослы чалавек з'яўляецца ў жыцці дзіцяці не раптам — яго рыхтуюць псіхолагі «Нітак сяброўства». З дзіцем знаёміцца чалавек ужо падрыхтаваны, які не перадумае сябраваць праз пэўны час, сутыкнуўшыся з цяжкасцямі і болем малога.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Гэта карысна

## СУМНА НЕ БУДЗЕ!

**Новую версію дзіцячага прававога сайта запусціць 1 чэрвеня, у Міжнародны дзень абароны дзяцей, Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі (НЦПІ). Гэта ўнікальны спецыялізаваны сайт па прававой адукацыі дзяцей і падлеткаў, створаны па ініцыятыве Адміністрацыі Прэзідэнта.**

Рэсурс http://mir.pravo.by існуе ўжо 12 гадоў. Сёлета яго ўнеслі ў спіс інтэрнэт-рэсурсаў з адукацыйнымі праграмамі для малых падчас падоўжаных з-за пандэміі канікул. Тут дзеці могуць замацоўваць пройдзены матэрыял, набываць новыя веды, у тым ліку юрыдычныя, атрымліваць адказы на «дарослыя» пытанні і падказкі, што рабіць у складаных сітуацыях.

Уся інфармацыя на сайце падаецца ў займальнай і даступнай форме, у тым ліку праз гульні, а шукаць адказы на пытанне дапамагае віртуальная Вараняня. Сайт разлічаны на дзяцей ад 6 да 16 гадоў. Малыя тут даведаюцца шмат цікавага пра розныя краіны, разгадаюць рэбусы і красворды, пройдуць тэсты. Падлеткі могуць таксама вывучыць «Юрыдычную азбуку», здзейсніць падарожжа ў свет фінансаў, вывучыць правілы дарожнага руху і высветліць, якія незвычайныя забароны і законы дзейнічаюць у іншых краінах.

У «Прававых лабірынтах» можна пазнаёміцца з «Жывой дэкларацыяй правоў дзіцяці», а яшчэ адправіцца ў "Падарожжа ў мінулае", каб даведацца пра мінулае нашай краіны і пазнаёміцца са славутымі продкамі. Падлеткі даведаюцца, як атрымаць пашпарт, уладкавацца на работу, набыць папулярнасць у школе, навучыцца правільна сябраваць і абараняць свае інтарэсы.

Новая версія 2.0, створаная пры падтрымцы прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН ЮНІСЭФ у Беларусі, мае новы дызайн, рэалізуе новыя сучасныя тэхналогіі і інавацыйныя падыходы да падачы інфармацыі, палепшаную сістэму навігацыі і новыя сэрвісы. Сайтам таксама стане зручней карыстацца праз смартфоны і планшэты. Стваральнікі абяцаюць, што дзецям будзе яшчэ цікавей авалодваць новымі ведамі і падарожнічаць па свеце юрыдычнай і прававой інфармацыі.

**Ірына СІДАРОК.**

# КОЖНАМУ ДЗІЦЯЦІ ПАТРЭБЕН СВОЙ ДАРОСЛЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Гісторыя стварэння арганізацыі моцна звязана з маім лёсам,— гаворыць Арцём. — Я вучыўся ў суворaўскім вучылішчы і ўжо тады зразумеў, наколькі важна мець дарослага чалавека, якому давяраеш, мець блізкія адносіны. Адразу пасля смерці мамы да мяне падышла яе сяброўка Вера і сказала, што мы, а гэта я і мой старэйшы брат, ёй неабыякавыя і што ў любы момант магу да яе звярнуцца ці проста прыехаць у госці. Я тады не надаў значэння гэтым словам, але ведаў, што такая магчымасць ёсць. У вучылішчы ж сутыкнуўся з сур'ёзным пачуццём адзіноты: бачыў, як да хлопцаў прыязджалі бацькі, якія падтрымлівалі сваіх дзяцей, падказвалі, што рабіць у пэўны момант, абаранялі, калі гэта было неабходна. Мне таксама хацелася мець такіх людзей побач. Я стаў прыязджаць у госці да Веры. У яе была свая сям'я: муж і дзеці. У іх я ўбачыў і адчуў, што магчыма мець цёплыя адносіны ў сям'і. Памятаю, як вырашыў, што ў мяне будзе таксама свая добрая і моцная сям'я, марыў пра гэта і тады ўжо пачаў рыхтавацца: стараўся вучыцца, каб потым больш зарабляць, займаўся спортам, каб быць фізічна моцным, каб жонка адчувала сябе пад маёй абаронай... Са мной побач былі бабуля з дзядулем і Вера, якая падтрымлівала мяне ў маім рашэнні, накіроўвала ў патрэбным напрамку. Я і сапраўды ўдала ажаніўся. У мяне нарадзіліся дзве дачкі, калі я вырашыў далучыцца да валанцёраў падчас нейкай акцыі. Памятаю, як мы набылі шмат кіндэр-сюрпрызаў дзецям-сіротам і нават пральную машыну для школы-інтэрната і паехалі. Мы выдатна правялі час: пазнаёміліся з хлопцамі і дзяўчатамі, пагулялі — усё было добра. Мяне пераклініла, калі мы ехалі назад у Мінск. Я зразумеў, што мог быць на іх месцы. Да мяне б прыехалі валанцёры на дзве гадзіны і потым зніклі з жыцця назаўсёды...

**«Любое няправільнае слова або дзеянне ў адносінах да сіраты могуць быць вельмі шкодныя, дзіця можа перастаць давяраць людзям і назаўсёды закрыцца ад грамадства».**

Дзеці пасля нашага ад'езду зноў вярнуліся да свайго дзетдомаўскага жыцця, да ўнутраных правілаў з іх праблемамі і радасцямі — яны нават не ўяўляюць, што іх чакае па-за сценамі гэтага часовага дома. Я ўспомніў, з якімі цяжкасцямі сутыкнуўся сам, як мне было адзінока... Згадаў Веру. Тады да мяне прыйшло ўсведамленне, што прыязджаць да дзяцей трэба не толькі падчас акцый, неабходна быць з імі побач, сябраваць і падтрымліваць рэгулярна, як гэта рабіла Вера. У хуткім часе я патрапіў у Кіеўскую школу, дзе займаліся тым, што рыхтавалі сяброў для сірот. Я працаваў з псіхолагамі і трэнерамі некалькі дзён. Яны змянілі маё жыццё. У Мінск прыехаў ужо з намерам стварыць пэўную каманду, якая будзе дапамагаць дзецям шукаць такіх сяброў.



***— А навошта вучыць дарослых сябраваць? Ці магчыма ўвогуле кантраляваць такое сяброўства?***

— З неразуменнем мы сутыкнуліся адразу. Людзі, якія займаюцца праблемамі сірот у нашай дзяржаве, сказалі, што больш за ўсё праблем у выпускнікоў школ-інтэрнатаў — з адаптацыяй у грамадстве, і настойліва прапанавалі нам займацца выпускнікамі. Мы па сутнасці гэта і рабілі, але ўбачылі, што многія праблемы можна было прадухіліць, калі б дзіця было меншае. Мы даведаліся, што шанцаў знайсці сям'ю больш у дзяцей да пяці гадоў. У разы скарачаецца гэтая магчымасць у тых, каму больш за пяць. Калі дзіцяці споўнілася дзесяць, то шанцаў амаль няма. Мы вырашылі шукаць блізкіх дарослых тым, каму ад 10 да 15 гадоў. Гэта той узрост, калі дзіця яшчэ гатова слухаць дарослых. Вельмі доўга адстойвалі магчымасць працаваць з дзецьмі гэтага ўзросту ў камітэце па адукацыі Мінгарвыканкама. Нас падтрымалі, але не адразу. Нам прыйшлося шмат папрацаваць у гэтым кірунку, што таксама правільна, бо людзі, адказныя за сірот, вельмі добра разумеюць: на коне жыццё чалавека, а не цацкі. Мы вывучылі заканадаўства і зразумелі, што такое сяброўства паміж пасталеўшымі дзецьмі і дарослымі называецца ў краіне патранатным выхаваннем.

***— У адным з інтэрв'ю вы казалі, што сапраўдным сябрам, які прынясе карысць для сіраты, можа стаць толькі псіхалагічна моцны чалавек...***

— Дзіця, якое аказалася ў інтэрнатнай установе, нягледзячы на ўзрост, атрымала сур'ёзную псіхалагічную траўму, таму нясе ў сабе пэўны згустак праблем, цяжкасцяў, перажыванняў і болю. І менавіта з гэтым сутыкаецца чалавек, калі блізка знаёміцца з сіратой. Дарослы павінен быць псіхалагічна моцным, каб дапамагчы з усім гэтым справіцца дзіцяці і самому пры гэтым застацца «пры сваім розуме». Такі чалавек павінен своечасова і правільна зрэагаваць на тыя выклікі, з якімі ён сутыкнецца, размаўляючы з дзіцем. Тая жанчына, якая стала маім сябрам у дзяцінстве, не праходзіла ніякіх курсаў, але яна была моцная асоба, яе рэакцыі на мае паводзіны былі правільныя. Любое няправільнае слова або дзеянне ў адносінах да сіраты могуць быць вельмі шкодныя, дзіця можа перастаць давяраць людзям і назаўсёды зачыніцца ад грамадства. Дарослы павінен трымаць у сваёй галаве мэту, з якой ён адважыўся дапамагчы дзіцяці. Гэты шлях не без перашкод. Калі ўсё атрымліваецца, то такія дзеці потым вельмі шануюць свайго сябра, бо разумеюць, што ён, нягледзячы на ўсе цяжкасці, не развярнуўся і не сышоў, а працягвае сябраваць. Трэба разумець, што не кожны дарослы гатовы трываць, напрыклад, хлусню і крадзеж ад дзіцяці, якому вырашыў дапамагаць. А дзеці ў гэтым жывуць, гэта іх жыццё, і наша задача паказаць, што можна інакш. Вельмі цяжка малому растлумачыць, што дарослы не справіўся, перадумаў з ім сябраваць. Чалавек павінен быць моцны і ўпэўнены ў сваім рашэнні. Я веру, што кожнае дзіця ўнікальнае ў сваіх магчымасцях і намерах, і калі дапамагчы, раскрыць яго, то свет можа атрымаць такіх людзей, як Стыў Джобс, Како Шанэль ды ўвогуле проста добрага чалавека.

***— Як адбываецца пошук і падрыхтоўка патранатных выхавальнікаў для дзяцей?***

— Мы расказваем аб гэтым у сацыяльных сетках, ладзім розныя мерапрыемствы, каб людзі звярнулі ўвагу на праблемы дзяцей. У нас былі такія праекты, як «Каманда мары», калі мы запрашалі знакамітых людзей, якія маюць пэўны аўтарытэт у грамадстве, разам з дзецьмі-сіротамі сыграць у футбол. Тлумачылі, для чаго гэта робім. Нам вельмі важна прыцягнуць для выхавання хлопчыкаў мужчын, якія маглі б праз свой асабісты прыклад і сяброўства з дзіцем дапамагчы яму паверыць у свае сілы і натхніцца. Дзякуючы гэтаму праекту каля сарака дзяцей з 11 да 16 гадоў знайшлі дарослых-сяброў, настаўнікаў. Былі і іншыя праекты, такія, як «Дружная кухня» для дзяцей і дарослых, якія любяць гатаваць ежу, «Кіламетры ніцяў сяброўства» — у ім удзельнічалі выхаванцы школ-інтэрнатаў і іх сябры, яны бегаюць доўгія дыстанцыі, каб прыцягнуць увагу людзей, якія хочуць дапамагчы дзецям. Пасля такіх праектаў да нас прыходзіць больш людзей, чым звычайна, каб даведацца аб законных і правільных магчымасцях дапамагчы сіраце.

***— Ну вось прыцягнулі вы ўвагу, да вас прыйшлі людзі, і што далей?***

— Спачатку мы праводзім інфармацыйную гадзіну. На яе звычайна прыходзяць чалавек 20. На зразумелай для людзей мове гаворым, як можна дапамагчы дзецям на самай справе. Расказваем аб тым, што ў ідэале дзяцей у школе-інтэрнаце не павінна быць, але калі няма магчымасці забраць дзіця назаўсёды, то можна паспрабаваць пасябраваць з адным дзіцем. Праўда, пасля нашай інфармацыйнай гадзіны, людзі адэкватна ацэньваюць свае рэсурсы і працэнтаў 40 сыходзяць увогуле. З тымі, хто застаўся, пачынае працаваць псіхолаг — індывідуальна. Пасля гэтага некаторыя таксама сыходзяць. І толькі пасля работы з псіхолагам мы пачынаем рыхтаваць людзей, вучым адэкватна рэагаваць на паводзіны дзіцяці, тлумачым, як можна дапамагчы малому «стаць на ногі». Застаюцца толькі цвёрдыя ў сваім рашэнні, хто разумее, што жыццё дзіцяці — не жарт. Усіх дарослых мы потым суправаджаем, дапамагаем вырашаць праблемы з дзіцем, падтрымліваем псіхалагічна...

***— А як жа дзеці? Яны могуць выбіраць дарослага?***

— Так, у нас ёсць магчымасць мець зносіны з дзецьмі і падбіраць такім чынам для іх дарослых сяброў. Мы супрацоўнічаем з кіраўніцтвам школ-інтэрнатаў, і яны раяць нам дзяцей. І, вядома, мы прыслухоўваемся. Ведаем гісторыю дзіцяці, яго асаблівасці і слабасці. Дзіця можа пажадаць сябраваць з сямейнай парай, мужчынам ці жанчынай. Тое самае і пра патэнцыйнага выхавальніка. Псіхолагі дапамагаюць супаставіць інфармацыю пра дзіця і магчымасць канкрэтнага дарослага дапамагчы яму. Мы падбіраем іх так, каб у дарослага і дзіцяці былі агульныя інтарэсы і падобны тэмперамент. Многія дзеці, у якіх з'яўляецца сябар, нават паступаюць ва ўніверсітэты, а гэта для іх ужо вялікае дасягненне. Для іх увогуле дасягненне — проста захацець вучыцца.

**«Мяне пераклініла, калі мы ехалі назад у Мінск. Я зразумеў, што мог быць на іх месцы. Да мяне б прыехалі валанцёры на дзве гадзіны і потым зніклі з жыцця назаўсёды...»**

***— Ці бывае, што людзі праз пэўны час такога сяброўства вырашаюць спыніць зносіны з дзіцем?***

— Я памятаю толькі адзін выпадак. Гэта была жанчына, якая пераязджала ў іншы горад і павінна была ў хуткім часе нарадзіць. Яна ацаніла ўласныя рэсурсы і сумленна расказала аб гэтым свайму падапечнаму. Яны не спынілі зносіны цалкам, жанчына падтрымлівала хлопца, праўда, не так актыўна, як гэта было напачатку... Але трагічных выпадкаў у нас няма. Людзі, якія рашаюцца пасябраваць з дзіцем, разумеюць, з якімі праблемамі сутыкнуцца, і гатовы да гэтага. Яны ўсведамляюць, што дапамагчы сіраце можна толькі сваёй увагай і асабістым прыкладам, а не кіндэр-сюрпрызам.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# Такі доўгачаканы і любімы

## Два праекты

Як вы зразумелі, Святлана Мілінкевіч і Аляксандр Дзядзюк ажаніліся ды адразу сталі сям'ёй з двума дзецьмі. Вядома, тут жа паўстала жыллёвае пытанне. Яны тады сталі на ўлік у сельвыканкаме, у парадку чаргі атрымалі ўчастак пад будаўніцтва. «Жылі на той час у інтэрнаце, разлічваць маглі толькі на свае фінансавыя сілы, думалі, што будаваць давядзецца доўгія гады, — расказвае маці сямейства. — Я хацела наш дом яшчэ меншым спраектаваць. Гэта Саша ўгаварыў не спяшацца з праектам, пераконваў, што будуць яшчэ дзеці ў сям'і. Заўважала, што мой муж вельмі любіць дзяцей, гэта было прыкметна нават па тым, як ён гуляе з малымі пляменнікамі. Нашы дзяўчынкі падрасталі, і хоць мне было за трыццаць, навіну пра будучае дзіця мы абое сустрэлі з вялікай радасцю. А дом пачыналі будаваць, калі мелі толькі дзвюх дзяўчынак. Да нараджэння ж чацвёртага дзіцяці — сына Вані — «каробка» дома была».

Дарэчы, у іх ёсць два праекты. Той, першапачатковы, разлічаны на меншы метраж, цяпер захоўваецца ў якасці старонкі сямейнай гісторыі. А ў справу пусцілі другі праект будынка плошчай 107 квадратных метраў. Дом складаецца з чатырох пакояў, прасторнай кухні, невялікіх гаспадарчых памяшканняў.

## «Каробка» плюс субсідыя

«Каробку» дома вывелі з зямлі дзякуючы таму, што ў шматдзетнага бацькі залатыя рукі, што ён робіць усё сам. «Але што такое «каробка»? — разважае Святлана. — Дом, мусіць, і сёння ўяўляў бы сабой «каробку», каб не субсідыя дзяржавы, якую мы як шматдзетная сям'я атрымалі ў 2017 годзе. Тады адразу заказалі і паставілі вокны, сталі рабіць усё ўнутры, напаўняць гэтую «каробку» патрэбным начыннем. Вядома, стараліся сэканоміць на ўсім. Напрыклад, мая справа ў банку на атрыманне субсідыі самая тоўстая ў параўнанні з іншымі. Бо я шмат чаго мяняла, перараблялa дакументы менавіта ў кірунку эканоміі. Не эканомілі толькі на ацяпленні: дом абкладзены мінватай, вокны мы падабралі энергазберагальныя. Вельмі многае ў гэтым будаўніцтве рабілі паступова, большую частку сваімі сіламі».

**«Не разумеем тых бацькоў шматдзетных сямействаў, якія замахваюцца на двухпавярховыя асабнякі, а потым наракаюць, што сродкаў субсідыі не хапае».**

У гэтым сэнсе сям'і пашанцавала, бо яе галава — прафесійны будаўнік, ён працуе мантажнікам-высотнікам у адной з брэсцкіх арганізацый. Адпаведна, многае ўмее, а ўменне сваё паспяхова прымяняе на будаўнічай пляцоўцы. Фактычна ўсё ўнутранае адстройванне гаспадар робіць самастойна. Паводле слоў гаспадыні, цяпер застаецца пакласці падлогу, пакleіць шпалеры, пафарбаваць унутры — і можна заязджаць. Ламінат на падлогу і плітку яны купілі загадзя за кошт субсідыі.

— Гэтыя 66 тысяч рублёў бюджэтнай субсідыі ўсё і вырашылі, — разважае Святлана Леанідаўна. — Мы



абое са звычайных сем'яў, у нас не было вялікіх зберажэнняў, на зарплаты будаўніка і спецыяліста рэкламнай службы пры ўмове ўтрымання чатырох дзяцей дом мы не хутка ўзвялі б. Мякка кажучы, не хутка. Вядома, хацелася б, каб былі грошы на агароджу і гаспадарчую пабудову ў двары, але іх не хапіла, і мы адклалі гэтую работу на пазнейшы час. Мы ўсведамляем, што і так нам вельмі добра дапамагла дзяржава. І не разумеем тых бацькоў шматдзетных сямействаў, якія замахваюцца на двухпавярховыя асабнякі, а потым наракаюць, што сродкаў субсідыі не хапае. Вядома, не хопіць, бо сёння ўсе будаўнічыя матэрыялы каштуюць вельмі дорага паводле мерак чалавека невысокага дастатку. Помню, як мы вялі нулявы цыкл. Здаецца, купіш бетон, яшчэ нешта, столькі грошай убухаеш у нейкую камунікацыю, а яе не відаць нават, усё ў зямлі. У мяне часам слёзы наварочваліся ў такой сітуацыі, але ж маўчала. Ведаю, што муж і так з усіх сіл імкнуўся ўсё ўзяць на сябе. Гэта цяпер я зразумела, што часам лепш наняць чалавека, запрасіць тэхніку, каб не рызыкаваць уласным здароўем, не надрывацца. Яму і на рабоце даводзіцца цяжка працаваць.

## Рэцэпт шчаслівай сям'і

— А вось цяпер, калі справа блізіцца да завяршэння, то і аптымізму прыбавілася, — працягвае Святлана. — Мы ўсе чакаем лета, каб разам з дзецьмі адсвяткаваць наша галоўнае сямейнае свята — наваселле. Бо пакуль часова жывём з бацькамі мужа. І хоць усяляк стараемся не ствараць нязручнасці сталым людзям, але гэта не надта магчыма на практыцы. У кватэры жыве восем чалавек, з іх чацвёра дзяцей, дзяўчаты цяпер вучацца дыстанцыйна. Яны сёлета цяжка перахварэлі на рэспіраторную інфекцыю, таму я не рашылася адпраўляць іх у школу. Тым больш што гэта вельмі адказныя вучаніцы. Ну а малыя, вядома, ствараюць сваю порцыю шуму і вэрхалу.

Святлана лічыць галоўным складнікам іх паспяховай сям'і тое, што яны з мужам аднадумцы. Яны ўмеюць эканоміць, у іх не ўзнікае спрэчак з нагоды расходавання грошай, бо ўсе свае сродкі ўкладваюць у дом і ў дзяцей. Дзеці ведаюць, што пакуль сям'я не можа сабе дазволіць паездку на мора ці нават аўтападарожжа ў межах краіны. Усе разам выязджаюць пагуляць у абласны цэнтр, наведваюць парк альбо Брэсцкую крэпасць, любяць ездзіць да сваякоў у вёску. Дзеці разумеюць бацькоў і не просяць нічога лішняга, наадварот, радуюць сваімі поспехамі. Старэйшая Соня заканчвае дзясяты клас, выдатніца ў школе. Дзяўчынка іграе на скрыпцы, не раз удзельнічала ў канцэртах — нават за межамі краіны. 10-гадовая Ульяна таксама паспяхова вучыцца ў школе, наведвае студыю выяўленчага мастацтва. Вядома, яе работы з часам упрыгожаць новы дом. Яна першая памочніца мамы ў гаспадарчых справах, умее дапамагчы з малымі, з задавальненнем корпаецца ў агародзе — па ўсім відаць, добрая гаспадынька вырасце. Шасцігадовы Захар не перастае здзіўляць бацькоў сваёй цікаўнасцю, у тым ліку да падзей у свеце. Яшчэ не ўмеючы чытаць, ён навучыўся знаходзіць патрэбную інфармацыю ў смартфоне. Хлопчык не гуляе, як большасць дзяцей, а праслухоўвае самыя розныя сюжэты — а пасля прагляду і праслухоўвання, бывае, ставіць у тупік сваімі пытаннямі. Напрыклад, нядаўна ён спытаў маму, чаму, на яе погляд, закатавалі Хрыста. І не пагадзіўся з яе трактоўкай біблейскай гісторыі — агучыў сваю. Маленькі Ванечка цікавіцца машынамі, ведае іх маркі і разнавіднасці. «Малы, вядома, усеагульны любімчык, яго ўсе песцяць, бо ён самы меншы і апошні ў сям'і, — расказвае Святлана. — Хоць муж нядаўна сказаў: «Каб мы з табой сустрэліся адразу, у маладосці, у нас было б не менш за шэсць дзяцей». А я думаю, два сыны і дзве дачкі, мама, тата ў сваім доме — гэта і ёсць камплект для поўнай і шчаслівай сям'і».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Брэсцкі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

#яжмаці!

# Яблычкі ад яблынькі...

**У нашай сям'і ёсць гісторыя, якая з павучальных ператварылася ў смешную. Упершыню я пачула яе ад свякрухі. Мы разглядалі старыя фатаграфіі, і яна мне расказвала, як цяжка было гадаваць дзяцей адной... Аднойчы яна паслала майго мужа Сашу — тады дзесяцігадовага хлопчыка — па смятану, якую прадавалі на разліў. У яго быў выдатны настрой, ён хутка дабег да крамы, набыў смятаны, паклаў яе ў авоську і з прыскокам пабег назад. Каб было яшчэ весялей, стаў раскручваць авоську са слоікам «сонейкам».**

Але здарылася неспадзяванае для дзіцяці і, у прынцыпе, відавочнае для дарослых. Слоік выслізнуў з авоські і гучна грукнуўся аб асфальт. Сашка ўспамінаў, як спрабаваў выратаваць смятану, якая па-здрадніцку расплывалася... Ён старанна сабраў рэшткі і склаў у авоську. Дадому ён ішоў як на кару, з жахам раз-пораз паглядваючы на сетку, з якой працягвала капаць смятана. Мама яго, вядома ж, сварылася — ёй было не да смеху.

У смешную гэта гісторыя ператварылася з-за нашай старэйшай дачкі Аляксандры. Ёй было каля 9 гадоў, калі мы ўпершыню знялі «пад дачу» домік у вёсцы. Паслала я яе па курыныя яйкі. Набыўшы іх, Аляксандра таксама шчаслівая бегла дадому, але сустрэла па дарозе пацешнага маленькага сабачку. Яна нічога лепш не прыдумала, як адбівацца ад шчанюка яйкамі. Ім абодвум было весела. Сцяміла дачка, што нарабіла, толькі пасля таго, як з пакета ўжо капала, а шчанюк з задавальненнем аблізваўся. Тады я не ведала, што рабіць, ці то смяяцца, ці то сварыцца на дачку за глупства. З мужам жа ўвечары жартавалі: маўляў, яблык ад яблынькі недалёка падае.



А днямі знаёмая мне паабяцала прывезці з Расіі «ікееўскія» талеркі. Калі, нарэшце, прыбыў мой заказ, я паслала адзінаццацігадовага сына Мішу па доўгачаканы посуд — знаёмая жыла недалёка, у суседнім доме. Праз дзесяць хвілін мой мабільнік разываўся ад паведамленняў. Мне тэлефанавалі суседзі, а хтосьці нават здымаў на фота, як мой сын вязе талеркі. Міша склаў восем талерак у тоненькі пакет і павесіў яго на руль ровара. Хлопчык ён суровы, па тратуары ездзіць не прывык, таму абраў сабе шлях па купінах. Суседзі мае, гаспадынькі чуллівыя, якія выпадкова назіралі за гэтай карцінай, хапаліся за сэрца кожны раз, калі пакецік з грукатам гахаў аб раму ровара. Я ў жаху чакала сына.

— Вось твае талеркі, — закрычаў ён з парога.

Я падбегла, выхапіла пакет і стала разглядаць кожную талерку. Ні трэшчынкі! З палёгкай уздыхнула, але сыну прачытала лекцыю аб адказнасці.

— Цётка Каця сказала, што на наступным тыдні кубкі прывязуць, але я па іх ужо не пайду, — пакрыўджана сказаў Мішка.

— Мама, мама, а можна я схаджу? — умяшалася дзевяцігадовая Ульяна.

— І я, і я, і я з ёй! — пралепятала чатырохгадовая Маланння.

Я паглядзела на дзяўчынак з лёгкім пачуццём трывогі за свае кубачкі.

— Разам пойдзем, — сказала ўслых упэўнена, разумеючы, што ад асінкі не народзяцца апельсінкі, і прыйдзецца вучыць на іншае, як паказвае досвед, не прыходзіцца.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Недзіцячыя справы

# МАЛАДЫЯ, ДЫ РАННІЯ

## Выйсці замуж у 16 і захаваць дарослыя правы пасля разводу ў 17

**Нягледзячы на тое, што ўзрост для шлюбу, згодна з законамі нашай краіны, пачынаецца з 18 гадоў, у выключных выпадках яго можна знізіць. Аднак не больш чым на тры гады — да 15. Летась у краіне зарэгістравалі 452 шлюбы непаўналетніх.**



### ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ШЛЮБНЫ ЎЗРОСТ

Шлюб паміж падлеткамі ў Беларусі не прызнаецца сапраўдным, калі асобе, якая не дасягнула 18-гадовага ўзросту, афіцыйна не быў зніжаны шлюбны ўзрост. Падстаў для дазволу на гэта можа быць толькі тры: цяжарнасць нявесты, нараджэнне дзіцяці або эмансіпацыя непаўналетняга — атрыманне ім поўнай дзеяздольнасці да дасягнення паўналецця. Эмансіпіраваным падлетак можа стаць са згоды бацькоў, калі ён з 16 гадоў працуе па працоўным дагаворы або займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Уступаць у шлюб могуць як двое непаўналетніх, якія маюць індывідуальны шлюбны ўзрост (зніжаны адпаведным дакументам), так і пары, дзе адзін з сужэнцаў ужо дасягнуў 18 гадоў, а другі — не. Каб зменшыць шлюбны ўзрост, патрэбна сумесная заява асоб, якія намерваюцца ажаніцца. Яна падаецца адначасова з заявай аб заключэнні шлюбу. Заява аб зніжэнні шлюбнага ўзросту павінна быць разгледжана ў загсе ў трохдзённы тэрмін, калі гэты орган не прызначыў больш кароткага тэрміну рэгістрацыі шлюбу. Пры гэтым згода на шлюб бацькоў ці папячыцеляў не патрабуецца.

— Зменшыць узрост, які дае права пабрацца шлюбам, можа толькі орган загс. Падобнае рашэнне іншых органаў не мае юрыдычнай сілы, — растлумачыла **Вольга ФЯДУЦІК, кансультант упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі.** — А спіс прычын для памяншэння ўзросту, прыведзены ў ч. 2 артыкула 18 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, з'яўляецца вычарпальным — ніякіх іншых падстаў, каб знізіць шлюбны ўзрост, не існуе. Уступленне ў шлюб непаўналетняга да дасягнення ім 18-гадовага ўзросту надзяляе падлетка грамадзянскай дзеяздольнасцю ў поўным аб'ёме з усімі вынікаючымі з гэтага наступствамі. Бацькі такога непаўналетняга не нясуць адказнасць за яго ўчынкі.

### АЖАНІЎСЯ — СТРАЦІЎ СТАТУС ДЗІЦЯЦІ

Набытая падчас заключэння шлюбу грамадзянская дзеяздольнасць непаўналетніх (дарослая адказнасць) цалкам захоўваецца нават пасля скасавання шлюбу.

> У Беларусі існуе тэндэнцыя да змяншэння колькасці шлюбаў з удзелам непаўналетніх. Яшчэ дзесяць гадоў таму доля такіх шлюбаў складала 1,2 % ад усіх, што рэгістраваліся ў краіне, а ўжо ў 2016-м яна панізілася да 0,3 %. Так, у 2013 годзе было 1005 пар з непаўналетнімі жаніхамі і нявестамі, у 2014-м — 899, у 2015-м — 815, у 2016-м — 629, у 2017-м — 517, у 2018-м — 574, у 2019-м — 452.

Калі падлеткі ажаніліся, скажам, у 16, а ўжо праз год 17-гадовыя муж і жонка разышліся, свой «дзіцячы статус» ім ужо не вярнуць — дарослыя правы застануцца пры іх.

— Суд можа прыняць рашэнне аб страце поўнай грамадзянскай дзеяздольнасці непаўналетніх, калі ён прызнае шлюб несапраўдным, — дадала Вольга Федуцік. — Напрыклад, высветліцца, што непаўналетнія не мелі сапраўднага намеру ствараць сям'ю (фіктыўны шлюб), або адкрыюцца моманты, якія не давалі падлеткам права жаніцца, і гэта будзе даказана судом. Шлюб забаронены паміж асобамі, з якіх хоць адзін чалавек ужо жанаты ці замужам, і паміж блізкімі сваякамі. Забараняецца таксама ствараць сям'ю з асобай, якая прызнана недзеяздольнай.

Васямнаццацігадовая мяжа для набыцця афіцыйнай магчымасці ўзяць шлюб у нашай краіне вызначана нездарма. Спецыялісты лічаць: каб стаць сужэнцамі і бацькамі, людзі павінны мець не толькі фізіялагічную, але і сацыяльна-псіхалагічную сцеласць, якая павінна надысці з паўналеццем.

Аднак у іншых краінах шлюбны ўзрост іншы. У Шатландыі, напрыклад, дазваляецца жаніцца з 16 гадоў, кітаянкі могуць выйсці замуж з 20, а кітайцы жаніцца — у 22. У Азербайджане жанчыны могуць распісвацца з 17, а мужчыны — з 18, у Сінгапуры ўступаць у шлюб дазволена з 21 года.

### УЛАСНАСЦЬ МУЖА, ЖОНКІ І АГУЛЬНАЯ

Нягледзячы на юны ўзрост, у абодвух непаўналетніх сужэнцаў да шлюбу можа быць уласнасць, якая належыць кожнаму паасобку і застанецца ім, калі маладыя раптам разводзяцца. Тое ж датычыцца і ўласнасці, якую муж або жонка асабіста атрымалі ў шлюбе ў дар або ў спадчыну.

Аднак рэчы і нерухомасць, набытыя падчас сямейнага жыцця, незалежна ад таго, на каго яны афармлены ці кім набытыя, з'яўляюцца іх агульнай маёмасцю, і муж і жонка маюць на іх роўныя правы.

— Акрамя таго, маёмасць кожнага з сужэнцаў можа быць прызнана агульнай, калі будзе ўстаноўлена, што падчас шлюбу за кошт агульнай маёмасці ці асабістай маёмасці мужа або жонкі былі зроблены ўкладанні, напрыклад, падчас капітальнага рамонту ці рэканструкцыі, якія значна павялічылі кошт гэтай маёмасці, — удакладніла спецыяліст. — Іншыя ўмовы падзелу маёмасці могуць быць прадугледжаны шлюбным дагаворам, які можна скласці да шлюбу або падчас яго. Прадстаўніцтва бакоў пры заключэнні гэтага дакумента не дапускаецца, аднак непаўналетнія жаніх і нявеста могуць скласці дагавор толькі са згоды сваіх бацькоў ці апекуноў. Выключэнне — толькі ў выпадку набыцця непаўналетнім дзеяздольнасці ў поўным аб'ёме.

Калі падлеткі ажаніліся і аўтаматычна набылі грамадзянскую дзеяздольнасць, пасля гэтага дазвол бацькоў на складанне шлюбнага дагавору ім ужо не патрэбны. Яны самі нясуць адказнасць за дарослыя рашэнні.

Шлюбны дагавор складаецца толькі ў пісьмовай форме і абавязкова пацвярджаецца натарыусам. Калі дакумент афармляецца да шлюбу, ён уступае ў сілу з дня рэгістрацыі новай сям'і. Калі ж маёмасныя адносіны ў дагаворы абазначаюць ужо сужэнцы, дакумент пачынае дзейнічаць з дня яго натарыяльнага засведчання.

Асаблівым пунктам з'яўляецца наяўнасць у шлюбным дагаворы ўмоў адносна нерухомасці. У гэтым выпадку дакумент набудзе законную сілу толькі пасля дзяржрэгістрацыі дагавора ў арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй. А дзяржрэгістрацыя можа адбыцца толькі пасля рэгістрацыі шлюбу.

**Ірына СІДАРОК.**

Дапамога

# ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ І КРЫЗІСНЫЯ ПАКОІ

## Куды звярнуцца ахвярам хатняга гвалту?

**У сучасным свеце людзі часцей за ўсё падвяргаюцца гвалту, як ні дзіўна, у сям'і. Для самых слабых і ўразлівых — для жанчын і дзяцей — рызыка стаць ахвярай сваіх блізкіх часта намнога вышэйшая, чым пацярпець ад чужых людзей. Каб дапамагчы ім, у Беларусі праходзіць штогадовая рэспубліканская прафілактычная акцыя «Дом без гвалту!».**

Дарэчы, ААН таксама нядаўна выказала занепакоенасць усплёскам гвалту ў сем'ях па ўсім свеце, які адбыўся ў сувязі з вымушанай самаізаляцыяй.

Што датычыцца нашай краіны, то людзі, якія сутыкнуліся з такімі праявамі, могуць бясплатна тэлефанаваць на нумар агульнанацыянальнай гарачай лініі для пацярпелых ад хатняга гвалту 8-801-100-8-801, прычым як з гарадскога тэлефона, так і з любога абаненцкага нумара А1. Кампанія А1 нядаўна падтрымала ініцыятыву Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) зрабіць званкі на гэтую гарачую лінію бясплатнымі для сваіх абанентаў. Такім чынам, у тых, хто апынуўся ў складанай жыццёвай сітуацыі, з'явілася больш магчымасцяў атрымаць своечасовую дапамогу — сацыяльную, псіхалагічную і юрыдычную.

— Званок на гарачую лінію для чалавека, які сутыкнуўся з гвалтам, — гэта першы крок на шляху атрымання падтрымкі, дапамогі і вырашэння праблемы, — кажа **кіраўнік офіса ЮНФПА ў Беларусі Вольга АТРОШЧАНКА.** — Часта ў пацярпелых узнікае адчуванне бездапаможнасці і безвыходнасці, у цяперашняй сітуацыі — у тым ліку і ў літаральным сэнсе. Таму так важна ведаць, з чаго пачаць, дзе шукаць дапамогу і куды можна звярнуцца ў пошуках падтрымкі і прафесійнай парады. Прыкладна 34 % кліентаў лініі — людзі старэйшага ўзросту, якія часцей за ўсё пакутуюць ад гвалту з боку дарослых сыноў і дачок. А сёння гэты гвалт узмацняецца, бо сем'і адчуваюць неспакой, эканамічны стрэс, праводзячы значна больш часу дома, у замкнёнай прасторы.

### Дзе яшчэ можна атрымаць дапамогу?

Сёння любы чалавек, які трапіў у цяжкую жыццёвую сітуацыю, у тым ліку пацярпеў ад гвалту, можа звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Іх у краіне налічваецца 146, таксама ёсць два гарадскія цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей — у Гомелі і Мінску.

Часовы прытулак ахвярам хатняга гвалту дае сетка крызісных пакояў. Усяго іх у краіне 136. Працуюць яны кругласутачна.

Такая паслуга аказваецца бясплатна і ўключае ў сябе выдзяленне спальнага месца з камплектам пасцельнай бялізны і, пры неабходнасці, забеспячэнне сродкамі асабістай гігіены, вадой і харчаваннем, паведамляюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Пры гэтым законам прадугледжана магчымасць забеспячэння часовага прытулку па месцы звароту незалежна ад месца рэгістрацыі або жыхарства. У выпадку экстраннай неабходнасці жанчына можа атрымаць прытулак нават пры адсутнасці ў яе дакумента, які сведчыць асобу. У перыяд пражывання ў крызісным пакоі пры неабходнасці таксама можа аказвацца дапамога па садзейнічанні ў працаўладкаванні, аднаўленні дакументаў, даецца псіхалагічная і прававая кансультацыя.



У 2019 годзе ў крызісных пакоях было размешчана 715 чалавек, у тым ліку 454 чалавекі, якія пацярпелі ад гвалту ў сям'і.

**Святлана БУСЬКО.**

**Тэлефонныя званкі на нумар 8-801-100-8-801 прымаюцца штодня з 8.00 да 20.00. Па аўторках і суботах на лініі дзяжурыць юрыст, у астатнія дні — псіхолаг.**

Ваш стыль

# ЭЛЕГАНТНАСЦЬ — ПА-ЗА ЎЗРОСТАМ!

**Жанчыны прыгожыя ў любым узросце. Толькі з выхадам на пенсію некаторыя пра гэта забываюць. Праект «Элегантнасць па-за ўзростам» закліканы нагадаць усім, што лічбы ў пашпарце — гэта не стан вашай душы, а прыгажосць — не абавязкова юнацтва. Аўтар праекта Аксана БАРЫСЕВІЧ выкладае курсы па стылі і этыкеце для сталічнага Цэнтра актыўнага даўгалецця. І студэнткі не перастаюць яе натхняць...**



***— Як нарадзілася ідэя даваць урокі стылю для жанчын 50+?***

— Ужо сёмы год я працую псіхолагам у Мінскім універсітэце трэцяга ўзросту. Там я часта бачу цудоўных, прыгожых ад прыроды жанчын. І разумею, што ўсё сваё жыццё яны прысвячалі сям'і, дзецям, унукам, кар'еры, вучобе... Але хацелася б, каб яны звярнулі ўвагу на сябе.

Былі і асабістыя прычыны, што пабудзілі заняцца гэтай тэмай. У маім жыцці тады надышоў час пераасэнсаванняў: я страціла бацькоў, калі яны толькі выйшлі на пенсію. Усё адбылося так раптоўна, што адразу перавярнула маё жыццё. Памянялася стаўленне да людзей гэтага ўзросту. Я напісала аўтарскія курсы па стылі і псіхалогіі, якія паступова ператварыліся ў праект «Элегантнасць па-за ўзростам».

Мы паўдзельнічалі ў конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend, дзе атрымалі падтрымку ад Швейцарскага Чырвонага Крыжа, і пачалі ўвасабляць ідэю ў жыццё. Самай малодшай вучаніцай стала 50-гадовая дама, а самай старэйшай было 80. Калі праект адбыўся ў Мінску, я вырашыла прывезці яго і ў іншыя гарады Беларусі. Пабывала з прэзентацыяй у Бабруйску, Пінску і родным Слоніме.

***— Пра што жанчыны даведаюцца падчас курса?***

— Мы шмат часу ўдзяляем базаваму гардэробу. Звычайна ў жанчын элегантнага ўзросту ўжо склаўся гардэроб, але калі паўстае пытанне «Што надзець?», бывае цяжка падабраць вобраз. Таму неабходна «скарбонка» універсальных рэчаў. З адной сукенкай можна зрабіць шэсць вобразаў, змяняючы аксесуары і абутак.

Асаблівую ўвагу мы звяртаем на візуальную карэкцыю фігуры. Яе не трэба ўвесь час выпраўляць — трэба правільна падабраць адзенне. Мы ўявілі занятні па харэаграфіі, гэта вельмі карысна для пастаці і пластыкі. Дамы сустракаюцца з экспертам па ўзроставым макіяжы: мы ўсе карыстаемся касметыкай, але з часам робіцца патрэбныя і іншыя сродкі, і іншая тэхніка нанясення.

Для мяне важна і тое, як жанчына змяніцца ўнутрана. Мае студэнткі, акрамя навучання, разам ходзяць у тэатры і на выстаўкі, падарожнічаюць і адкрываюць для сябе новыя ўражанні.

***— Вы называеце ўзрост сваіх студэнтак «элегантным». Чаму менавіта гэтае азначэнне?***

— Элегантнасць — гэта не толькі пра стыль адзення, гэта і пра адукаванасць, манеры, уменне падаць сябе. Я не прымаю вызначэння «пенсіянеры», «пажылыя», «старыя». Яны ператвараюць мае студэнтак у няўпэўненых у сабе, слабых людзей, што абсалютна не так.

***— Ці ёсць асаблівасці ў рабоце з жанчынамі элегантнага ўзросту?***

— Вучаніцы патрабуюць увагі і павагі да свайго меркавання, з імі цяжка спрачацца. Але для мяне важны пазітыў, які зыходзіць ад гэтых жанчын. Мы вучымся адна ў адной. А якія шыкоўныя парады яны даюць па гаспадарцы і выхаванні дзяцей! Многія дзеляцца сваімі гісторыямі, жыццёвым і прафесійным вопытам.

Усё гэта арганічна ўпісваецца ў нашы ўрокі. Некаторыя расказвалі, як выжывалі пасля вайны, як перашывалі ўборы і стваралі прыгажосць з нічога. Калі 80-гадовая жанчына прыходзіць на занятак у шыкоўным модным паліто, якое пашыла сама... Гэта цудоўна! Нашы жанчыны не перастаюць мяне натхняць.

***— Якія «памылкі стылю» часта робяць жанчыны 50+?***

— Некаторыя любяць начапіць на сябе шмат аксесуараў. Калі я бачу гэта, успамінаю нелюбімае мной слова «прыбірацца». Яно недарэчы, калі гаворка ідзе пра жанчыну. Так кажуць пра навагоднюю ёлку, якую трэба густа ўпрыгожыць. Але і на жанчынах можна ўбачыць шмат масіўных кольцаў, каралях, ланцужкоў і завушніц, што крыху расчароўвае. На шчасце, гэтая тэндэнцыя сыходзіць, але я заўсёды нагадваю, што ўпрыгажэнняў на целе павінна быць не больш за тры.






Кідаецца ў вочы, калі жанчыны спрабуюць за кошт адзення, макіяжу, аксесуараў і прычоскі «маладзіцца». Ім гэта не трэба, бо досыць падкрэсліць вартасці, якія ў іх ужо ёсць. Прыгажосць у 18, у 30 і ў 60 розная, але ў кожнай пары ёсць сваё хараство. У дзяцінстве мы карпаліся ў сабе: вушы не такія, нос не падабаецца, валасы прамыя — закруціць, кучаравыя — выпраміць. Але ў пэўным узросце мы прымаем і любім сябе такімі, якія мы ёсць.

Вядома, часам трэба «асвяжыць» вобраз — напрыклад, змяніць стрыжку ці колер валасоў. Але без фанатызму. Бо часам знешнія змены падштурхоўваюць да унутраных. Падумайце: што б вы хацелі прыўнесці ў сваё жыццё?

***— Што павінна быць у гардэробе ў кожнай жанчыны?***

— Для пачатку я параіла б усім правесці інвентарызацыю. Часта атрымліваецца, што ў нас ёсць 15 блуз і ўсяго адна пара туфляў. Ці шэсць спадніц. Мяне гэта заўсёды здзіўляла: навошта жанчыне столькі спадніц? Пакіньце тры і камбінуйце з блузамі, жакетамі і кашулямі.



У кожнай дамы павінны быць спадніца-аловак і класічныя штаны. Пераважная колеравая гама — чорны, цёмна-сіні, шэры. Выдатна, калі ў вас ёсць сукенка-футляр, але не варта забываць, што ў ёй адсутнічаюць рукавы. А мае студэнткі закрываюць плечы. У гэтым выпадку можна надзець жакет, накінуць паланцін або хустку.

Калі купляеце жакет — раю браць аднатонны, каб яго можна было спалучаць са спадніцай, штанамі і іншым адзеннем. Мужчынскія кашулі можна камбінаваць практычна з усім, смела выкарыстоўвайце іх. Таксама раю ўкласці грошы ў адзін добры кашаміравы світар, каб ён быў зручны і падыходзіў да стварэння некалькіх вобразаў адначасова. Але яго трэба старанна даглядаць і не надзяваць пад верхнюю вопратку.



Добрая пара туфляў — гэта бяспройгрышны варыянт пакупкі. Пара цёмных і пара бэжавых. Ну і вядома, вы не пашкадуеце, калі ўкладзяце грошы ў якасную сумку.

***— Якія сучасныя трэнды вам імпануюць?***

— Мяне радуе, што апошнім часам больш людзей у сферы моды даюць рэкамендацыі дамам элегантнага ўзросту — у тым ліку беларускія кампаніі, якія звяртаюць увагу на жанчын 50+.

Напрыклад, мы супрацоўнічаем з «Калінкай». Адзін з практычных заняткаў курса праводзім у іх краме. Кожнай студэнтцы выдзяляецца 30—40 хвілін для стварэння вобраза, кансультанты дапамагаюць падабраць адзенне, мы займаем адну з прымерачных і эксперыментуем.

Яшчэ любім брэнд адзення Volha. Мы сябруем са стваральніцай праекта, студэнткі з задавальненнем заказваюць у яе адзенне. Бо заўсёды камфортна ў рэчах, якія шыюць для цябе і пад цябе.

***— Ці ёсць тэндэнцыі, якія здаюцца вам недарэчнымі?***

— Модныя колеры — іх заўсёды трэба выбіраць з асцярогай. З сезона ў сезон дызайнеры прыўносяць у калекцыі новыя яркія адценні. І казаць, што гэтая яркасць будзе дарэчы для жанчын 50+, я не стала б. Адразу выключаем з гардэробу ўсе неонавыя колеры.

Мае студэнткі вельмі любяць чорны, я таксама. Але ён можа падкрэсліваць недахопы, якія з'яўляюцца з узростам: пігментныя плямкі, маршчынкі і сасудзікі. Выключаць гэты колер не варта: усе нюансы можна выправіць, калі размясціць бліжэй да твару яркі аксесуар — напрыклад, брошку або хустку.

***— Якіх рэкамендацый прытрымлівацца вясной і летам?***

— Гэта пара абнаўленняў і лёгкасці ў вобразе. Не баймся арыгінальна выкарыстоўваць шалікі і хусткі. Надвор'е пераменлівае, але не абавязкова надзяваць аб'ёмную рэч — можна завязаць паланцін, і гэта будзе выглядаць стыльна.

Пажадана, каб цёмныя тоны прысутнічалі толькі ў ніжняй частцы вобраза. Верх — пастэльныя тоны. Абутак таксама не «цяжкі». Абцас павінен быць невысокі і ўстойлівы.

***— Вы даяце кансультацыі мужчынам?***

— Мужчыны часта пытаюцца, калі я напішу курс і для іх. Гэтая ідэя даўно займае мяне. Цяпер я даю разавыя кансультацыі знаёмым і сваім студэнткам, якія звяртаюцца па парады для мужоў. Я развіваюся ў гэтым кірунку, многае вывучаю пра мужчынскі стыль і спадзяюся, што хутка змагу напісаць паўнавартасны курс.

***— Што стане наступнай мэтай праекта «Элегантнасць па-за ўзростам»?***

— Фокус на іншыя сацыяльныя групы. Напрыклад, мяне цікавіць інклюзія. Выдатна разумею, што людзі трэцяга ўзросту таксама ўваходзяць у гэтую катэгорыю, таму атрымліваю спецыяльную адукацыю для работы ў гэтай сферы. Паспяховым стаў вопыт правядзення майстар-класаў для онкапацыентак. Гэта яшчэ раз даказвае: не важна, які ў жанчыны дыягназ і колькі ёй гадоў, — яна заўсёды імкнецца да прыгажага.

**Віталіна БАНДАРОВІЧ.**
**Фота дадзена Аксанай БАРЫСЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

# Продавец – ОАО «ОРС Гомель»

**Оператор электронной торговой площадки –**

**«Единая система электронных торгов» torgi.gov.by**

**Предмет электронных торгов и его месторасположение**

**ЛОТ № 1. КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ – ЗДАНИЕ МАГАЗИНА № 83,** расположенное по адресу:

**г. Калинковичи, ул. Подольская, 49а, инв. № 333/С-55288, общая площадь 100,3 кв. м,**

**назначение – здание специализированное розничной торговли;**

- капитальное строение – здание склада, инв. № 333/С-37902, общая площадь 118,6 кв. м, назначение – здание склада;
- капитальное строение – здание погреба, инв. № 333/С-37886, общая площадь 15,7 кв. м, – назначение – здание погреба;
- капитальное строение – здание (туалет), инв. № 333/С-37885, общая площадь 0,9 кв. м, назначение – здание туалета;
- дерево – береза 1 ед., инв. № 483001.

**Информация о земельном участке:** объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 322350100001000661, площадью 0,0956 га, право постоянного пользования, назначение – для обслуживания здания магазина № 83.

**КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ – ЗДАНИЕ СТОЛОВОЙ № 9,** расположенное по адресу:

**г. Калинковичи, ул. Подольская, 49б, инв. № 333/С-55303, общая площадь 250,0 кв. м, назначение – здание столовой.**

**Информация о земельном участке:** объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 322350100001000943, площадью 0,0434 га, право постоянного пользования, назначение – для обслуживания здания столовой № 9.

**Лоту принадлежит оборудование:**

камера холодильная ДНХ-6,6, инв. № 443003, система охранной сигнализации, инв. № 446054, кондиционер марки Ballu -24H, инв. № 444140, кондиционер марки Ballu-24H, инв. № 444143, котел КЧМ-5-К 40кВт 5 секций, инв. № 444129.

**Начальная цена с НДС 20 % – 72 426,89 бел. руб.**

**Задаток 10 % от начальной цены – 7242,69 бел. руб.**

**ЛОТ № 2. КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ – ЗДАНИЕ МАГАЗИНА № 71,** расположенное по адресу:

**г. Калинковичи, ул. Октябрьская, 103, инв. № 333/С- 85043, общая площадь 443,8 кв. м,**

**назначение – здание специализированное розничной торговли;**

- капитальное строение – здание склада, инв. № 333/С- 40922, общая площадь 106,9 кв. м, назначение – здание склада;
- забор металлический, инв. № 333/С- 420005.

**Информация о земельном участке:** объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 322350100002002923, площадью 0,1797 га, право постоянного пользования, назначение – для обслуживания здания магазина № 71.

**Лоту принадлежит оборудование:**

- кондиционер промышленный WSH-307 BE, инв. № 443135, котел КС-Т-2, инв. № 444130;
- система охранной сигнализации, инв. № 446600.

**Начальная цена с НДС 20 % – 97 419,84 бел. руб.**

**Задаток 10 % от начальной цены – 9741,98 бел. руб.**

1. **Электронные торги состоятся 08.06.2020 на электронной торговой площадке оператора torgi.gov.by**.
2. Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», размещенным на сайте: torgi.gov.by
3. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, аккредитованное на электронной торговой площадке, подает оператору электронной торговой площадки заявление и документ, подтверждающий внесение суммы задатка.
4. Последний день подачи заявлений – **07.06.2020.**
5. Шаг аукциона 5 % от начальной цены предмета торгов.
6. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить на расчетный счет Продавца сумму фактических затрат согласно прейскуранту торговой площадки в течение пяти календарных дней со дня проведения торгов.
7. После совершения победителем торгов (претендентом на покупку) названных действий и представления организатору копий платежных документов, но не позднее десяти рабочих дней, с победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями торгов заключается договор купли-продажи имущества.
8. Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел. 37529 6672143.

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1 – склад (склад),** общ. пл. **4 131 кв. м**, инв. № **200/С-49769**, по адресу: **г. Витебск, ул. Базовая, д. 8.** Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание с двумя пристройками, рампой и навесом. Начальная цена с НДС 20 % – **472 607,28 бел. руб.**
**Обременение: договор аренды.** Подробная информация на сайте WWW.CPO.BY
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 1,0954 га для обслуживания складских помещений

**Лот № 2 – здание мастерской шиномонтажа** (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции))**,** общ. пл. **98,5 кв. м**, инв. № **200/С-45414**, по адресу: **г. Витебск, ул. Базовая, д. 8а.** Начальная цена с НДС 20 % – **35 480,34 бел. руб.**
**Обременение: договор аренды.** Подробная информация на сайте WWW.CPO.BY
**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве аренды (по 06.02.2037) общей площадью 0,0148 га для содержания и обслуживания мастерской шиномонтажа

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества: по лоту № 1 – не позднее **10** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи, по лоту № 2 – не позднее **15** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, удостоверением, заключением (государственной регистрацией) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией перехода права собственности на капитальные строения, а также перехода прав на земельные участки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **30.06.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **26.06.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

# ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества –

Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-282, расположенное по адресу: г. Могилев, ш. Славгородское, 18А, общей площадью 117,2 кв. м, год постройки – 2004** |
| **Начальная цена продажи** | 14460,00 (четырнадцать тысяч четыреста шестьдесят белорусских рублей, 00 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 2410,00 (две тысячи четыреста десять белорусских рублей 00 копеек) |
| **Сумма задатка** | 723,00 (семьсот двадцать три белорусских рубля 00 копеек) – 5 % |
| **Открытый аукцион состоится** | **16.06.2020 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | **В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 15.06.2020 включительно по адресу: г. Могилев, ул. 30 лет Победы, д. 3, второй этаж, кабинет 209** |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (8-0222)-403122, моб. 8029-169-39-68 |

*Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 723,00 белорусских рублей на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.*

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

